ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 29 (1103) 20 ліпеня 2013 г. Кошт 4500 рублёў.

"ЗА ДУХОЎНАЕ АДРАДЖЭННЕ" ПРЭМІЯ

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

У Мірскім замку з 26 ліпеня паказваюць 27 эскізаў і малюнкаў Канута Русецкага з альбома 1844 — 1846 гадоў. Сярод іх — такая малавядомая выява замка, з якой, як мяркуецца, бярэ пачатак традыцыя рамантычнага адлюстравання як гэтых муроў, так і нашай спадчыны наогул.

МІР РУСЕЦКАГА: ТАКІМ ЗАМАК НЕ БАЧЫЛІ

С. 2

Беларусы ў свеце: **сустрэчы з землякамі** С. 10 — 11

Рэарганізацыя кінасферы: **абмяркоўваем** С. 3

"Славянскі базар у Віцебску": **вынікі, перспектывы** С. 4 — 5

Слова эксперту: **якія выстаўкі каціруюцца?** С. 5

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

ЦІ АЗНАЧАЕ АДСУТНАСЦЬ БЕЛАРУСІ НА "АРТ-БАЗЭЛІ" ТОЕ, ШТО МЫ — ПА-ЗА СУСВЕТНЫМ КАНТЭКСТАМ? С. 12 — 13

РЭЖЫСЁРАМ СТАНЕ... АДЗІН З ПЯЦІ С. 8

ЗАБОЙСТВА ПЭНА: ЯШЧЭ АДНА ВЕРСІЯ ЗЛАЧЫНСТВА С. 14



ГЕАМЕТРЫЯ "ART-БЛОГУ" С. 8 — 9

Падзея тыдня

15 ліпеня Беларускі дзяржаўны тэатр лялек сустрэў сваё 75-годдзе. Трупа зараз у адпачынку, таму напярэдадні юбілею адбылося хіба ганаровае гашэнне паштовай маркі серыі "Тэатры Беларусі". Новы 76-ты сезон адкрыецца 21 верасня прэм'ерай "Малыша і Карлсана" ў пастаноўцы маладога, але ўжо нашумелага рэжысёра Аляксандра Янушкевіча.

Тэатр чароўных падарункаў

Не схільны да маштабных святкаванняў, тэатр адзначае свае круглыя даты зусім не "дацкімі" пастаноўкамі, а філасофскімі разважаннямі пра вечныя духоўныя каштоўнасці. На юбілейны сезон прыпалі прэм'еры двух значных для ўсёй нашай нацыянальнай культуры твораў: гэта "Дзяды" Адама Міцкевіча і "Ладдзя Роспачы" Уладзіміра Караткевіча. Вось дзе свята!

Ёсць у рэпертуары і спектакль, які на працягу ўсяго існавання тэатра быў яго своеасаблівым "лейтматывам" і частай "візітоўкай" у замежжы. Гэтая папраўдзе знакавая п'еса Віталя Вольскага, напісаная паводле беларускай народнай казкі, у 1939 годзе сталася першай нацыянальнай пастаноўкай тэатра і пазней практычна ніколі не сыходзіла з яго сцэны. Вельмі сімвалічная сама яе назва — "Чароўныя падарункі". Праўда, у некаторых пастаноўках яна змянялася на "Дзед і Жораў". Але цяперашняя, што была ажыццёўлена галоўным рэжысёрам тэатра Аляксеем Ляляўскім да пачатку 74-га сезона, вярнулася да пачатковай аўтарскай назвы.

Сапраўды, усе гэтыя гады тэатр дорыць дзятве і дарослым папраўдзе чароўныя падарункі — літаральна "Па шчупаковай волі", з якой і пачынаўся тэатр у 1938-м, прычым у Гомелі, але арыентуючыся на адпаведны спектакль у Маскве, у знакамітым Тэатры Сяргея Абразцова. А вось наша сталіца стала радавацца лялькам толькі з 1950-га.

Быў час, калі лічылася, што лялькі павінны быць максімальна падобнымі на людзей. Сёння ж, наадварот, яны ўсё часцей саступаюць месца самім людзям — артыстам, якія іграюць у спектаклях нароўні з лялькамі, а то і колькасна пераважаюць іх. Невыпадкова афіцыйны сайт тэатра сустракае нас "народнай прыкметай": "Лялька збегла — авангарду быць". Праўда, з авангардам у тэатры ўсё было нармальна яшчэ і да масавых "уцёкаў" лялечных персанажаў. Бо з 1960-х трупа рэгулярна ездзіць па фестывалях, а з 1990-га ладзіць свой уласны Міжнародны фестываль тэатраў лялек, арыентуючыся на самыя новыя ды перспектыўныя эстэтычныя тэндэнцыі. Таму сёння наш Лялечны правільней было б называць універсальным, заснаваным на сінтэзе ўсіх відаў мастацтва і іх жанраў, уключаючы тую ж оперу. Ну а якім атрымаецца "Малыш і Карлсан", даведаемся.

Надзея БУНЦЭВІЧ

На здымку: сцэна са спектакля "Вянчанне" — аднаго з лаўрэатаў Нацыянальнай тэатральнай прэміі.

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Кінапрацэс

Нобеля ўручаць у Нясвіжы…

…Бо ў Стакгольм далёка ехаць. Так вырашылі на Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" і ў прадзюсарскай кампаніі "Маскіт", якія сумесна ствараюць поўнаметражны камедыйны іграві фільм "З Восьмым Сакавіка, мужчыны!".

Фільм распавядае пра трыццацігадовую жанчыну, якой не шанцуе ў асабістым жыцці, і праз гэта ў яе склалася негатыўнае стаўленне да мужчын. Аднак, атрымаўшы нейкім чынам здольнасць чуць іх думкі, яна адкрывае ў мужчынах шмат станоўчага. Такое вось Восьмае Сакавіка… Падзеі адбываюцца ў навуковым асяродку. Аўтары фільма, сярод іншага, маюць на мэце стварыць крэатыўны вобраз маладых навукоўцаў.

Здымкі праходзяць у Беларусі і Расіі. Рэжысёр — Арцём Аксёненка, прадзюсар — Ганна Крутава, у фільме задзейнічаны акцёры з Беларусі, Расіі, ЗША. Днямі адбылася прэс-канферэнцыя, на якой творчая група карціны распавядала журналістам пра зробленую работу і перспектыву. У Беларусі, у Нясвіжскім палацы, як ужо адзначалася, здымалі… Швецыю. Бо паводле сцэнарыя героі атрымліваюць Нобелеўскую прэмію, якую, як вядома, уручаюць у Стакгольмскай ратушы. Гэтая акалічнасць справакавала журналісцкае пытанне: калі наш нацыянальны брэнд прадстаўлены ў стужцы як замежжа, дык што ў ёй увогуле будзе беларускім?

Прадзюсар Ганна Крутава адказала, што ў кінематографе гэта звычайная практыка, калі нейкая краіна ўвасабляе на экране іншую. Ёй, у прыватнасці, вядомы выпадак, калі Маскву здымалі ў Празе, бо ў самой Маскве здымачнай групе не былі створаны зручныя ўмовы для працы. Яна мяркуе, што для Беларусі было б вельмі карысна, каб яе краявіды і вытворчая база Нацыянальнай кінастудыі зацікавілі кінапрадзюсараў з розных краін.

Работа над стужкай працягнецца ў Маскве, дзе, сярод іншага, будзе зняты такі эфектны эпізод, як скачок з вяршыні хмарачоса "Фэдэрацыя" (вышыня — 376 метраў). Карціна ствараецца найперш для краін Садружнасці. Але прадзюсары спадзяюцца, што яна зацікавіць не толькі постсавецкую прастору. Для гэтага да ўдзелу ў фільме прыцягнуты акцёры і пастаноўшчыкі, знаёмыя з заходнім кінарынкам.

П.В.

Вернісаж

Мір Русецкага: такім замак не бачылі

К.Русецкі. "Навагрудак".

Выстаўка твораў Русецкага падрыхтавана музеем "Замкавы комплекс "Мір" сумесна з бібліятэкай Літоўскай акадэміі навук імя Урублеўскіх.

Альбом малюнкаў быў створаны пераважна пад час падарожжаў Канута Русецкага па Наваградчыне ў сярэдзіне XIX ст. Альбом уяўляе з сябе калекцыю графічных і акварэльных малюнкаў. Значная іх частка была створана мастаком пад час падарожжа праз Наваградак, Нясвіж, Сноў і Мір у 1844 г. Альбом Канута Русецкага цікавы як мастацкі погляд тагачаснага віленскага творцы на Наваградчыну ды Віленшчыну праз прызму ягонай уласнай ідэнтычнасці, мастацкіх густаў і таленту.

Культурны твітар: мы ў свеце

"Талерантнасць" стала лідарам

Германія

Плакат "Tolerance" беларускага дызайнера Юрыя Тарэева ўвайшоў у трыццатку пераможцаў Міжнароднага конкурсу сацыяльнага плаката "Mut zur Wut", у якім у гэтым годзе прынялі ўдзел сотні плакатыстаў з 66 краін. Плакаты-пераможцы, паводле задумкі арганізатараў, з'явяцца ў эпіцэнтры сучаснага жыцця, аб праблемах якога яны і расказваюць. Гэтымі днямі выстаўка праходзіць у нямецкіх Хайдэльбергу і Мангейме. А неўзабаве яе змогуць пабачыць жыхары ды госці нямецкіх Берліна і Мюнхена, мексіканскай Оахакі і турэцкага Кютах'я.

Славакія

Днямі ў Музеі славацкага нацыянальнага паўстання горада Банка-Быстрыца адкрылася выстаўка "Беларуская народная ікона" з музейных фондаў Гомельскага палацава-паркавага ансамбля. На ёй прадстаўлены 87 прадметаў, у тым ліку ручнікі, рукапісныя кнігі і народныя абразы Палесся сярэдзіны і 2-й паловы XIX стагоддзя. Акрамя таго, яшчэ адзін міжнародны буйны выставачны праект гомельскі музей рыхтуе для жыхароў Разані. Так, бліжэйшым часам у Разанскім крамлі будзе дэманстравацца этнаграфічная выстаўка "Буслы".



"Талерантнасць" Юрыя Тарэева ў гарадской прасторы і "сольна".

Польшча

З гісторыяй Брэсцкай крэпасці з нядаўняга часу можна пазнаёміцца ў галерэі Творчага дома "Рэймантаўка" павета Сельдцы Мазавецкага ваяводства Польшчы. Фотавыстаўка "Брэсцкая крэпасць: 1921 — 1939 гады" была арганізавана пры падтрымцы Культурнага цэнтра Беларусі ў Варшаве. У рамках праекта прадстаўлены фотаздымкі і дакументы з фондаў славутага мемарыяльнага комплексу, а таксама нямецкіх прыватных калекцый.

Расія

Знакавай падзеяй у культурным жыцці Калінінграда стала адкрыццё ў Абласным гісторыка-мастацкім музеі выстаўкі "Я — шлях, які не ведае вечнага спакою" з фондаў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы. Выстаўка працягвае плённую традыцыю абменаў экспазіцыямі ды матэрыяламі калінінградскіх і беларускіх культурна-асветніцкіх устаноў.

Гастролі

Ноч, Каўнас і Вердзі

Ансамбль салістаў аркестра "Premier" Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра прадстаўляў нашу краіну ў Каўнасе на Дне дзяржавы і фестывалі "Аперэта ў Каўнаскім замку".

Раней некалькі спектакляў паказваліся ў рамках Дзён культуры Беларусі ў Літве і Літвы — у Беларусі. Магчымасці шырокіх культурных абменаў дае і Дамова аб супрацоўніцтве, падпісаная непасрэдна з Каўнаскім дзяржаўным музычным тэатрам. У красавіку нашы рэжысёр Настасся Грыненка і харэограф Дзмітрый Якубовіч ставілі там дзіцячую оперу З.Хагагарцяна "Шапка з вушамі", у 2014-м каўнаская творчая група будзе ажыццяўляць у нас прэм'еру аперэты "Фіялка Манмартра" І.Кальмана, а ўжо гэтай восенню, у лістападзе, наша трупа паедзе туды "гастраляваць-фестываліць" з операй "Паяцы" Р.Леанкавала, прычым на італьянскай мове (у нас гэты спектакль ідзе на рускай), і гала-канцэртам.

Дый ансамбль "Premier", які існуе з 2008 года і часцяком выступае ў фае нашага тэатра перад спектаклямі, неаднойчы бываў з канцэртамі ў Пасольстве Беларусі ў Літве. На фестывалі ж "Аперэта ў Каўнаскім замку", дзе былі таксама салісты з ЗША і Расіі, нашы артысты аказаліся першымі ўдзельнікамі з Беларусі. Для выступлення яны нават змянілі склад ансамбля. Калі раней гэта быў класічны габойны квартэт (габой + струннае трыа), дык зараз атрымаўся квінтэт, прычым нетрадыцыйны: габой, скрыпка, віяланчэль, кантрабас і вібрафон. Фестывальны канцэрт, у якім яны ўдзельнічалі, быў прымеркаваны да 200-годдзя з дня нараджэння Дж.Вердзі. Таму музыканты звярнуліся да знакамітага майстра крэатыўных аркестровак Льва Карпенкі, які сачыніў для іх склада арыгінальную фантазію на самыя вядомыя оперныя тэмы італьянскага класіка, знітаваўшы мелодыі з "Набука", "Аіды" і, зразумела, "Травіяты", якой Каўнаскі тэатр адкрываўся ў 1920 годзе.

— Аранжыроўка выклікала цікавасць, — расказаў кіраўнік ансамбля "Premier", габаіст Сяргей Тумаркін. — Многія здзіўляліся, як нам удалося спалучыць "неспалучальныя" тэмбры. Хацелася паказаць штосьці незвычайнае, а таксама пазнаёміць публіку з нашымі інструменталістамі, сярод якіх — фантастычны ўдарнік Сяргей Буранаў, запрошаны граць у Марыінскі тэатр у Санкт-Пецярбургу. Канцэрт праходзіў позна ўвечары ля сцен Каўнаскага замка (дарэчы, падобнага да Лідскага). Народу сабралася, па падліках тамтэйшых журналістаў, да 10 тысяч чалавек.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Фотасюжэт нумара

У рамках "Славянскага базару ў Віцебску" Музей-сядзіба Ільі Рэпіна "Здраўнёва" папоўніўся 14 высакаякаснымі копіямі работ творцы. Рэпрадукцыі былі выкананы пры фінансавым удзеле Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Наш фотакарэспандэнт Юрый ІВАНОЎ адзняў карціны ў інтэр'ерах "Здраўнёва". Нагадаем, да аднаўлення сядзібнага дома ў свой час спрычынілася рэдакцыя газеты "Культура".

Абновы Здраўнёва

Трэба абмеркаваць!

Якія плюсы і мінусы ўваходжання "Белвідэацэнтра" ў структуру "Беларусьфільма"?

Да канца бягучага года РУП "Беларускі відэацэнтр" мусіць далучыцца да Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм". Паводле папярэдніх даных, прадпрыемства стане чацвёртым падраздзяленнем кінастудыі і будзе пераўтворана ў студыю спецыяльных праектаў. Навіна аб гэтай рэформе, агучаная пару тыдняў таму, нягледзячы на чаканне пэўных крокаў, выклікала абмеркаванне ў шэрагах кінаграмады. Што ж мы будзем мець на выхадзе аб'яднання арганізацый?

Андрэй КУЦІЛА, кінарэжысёр:

— Я маю вопыт супрацоўніцтва са студыяй "Летапіс" — падраздзяленнем "Беларусьфільма", з "Белвідэацэнтрам". Аднак навіну аб далучэнні апошняга да Нацыянальнай кінастудыі я ўспрыняў са шкадаваннем. Актыўнасць "Белвідэацэнтра" апошнім часам нельга не заўважыць: яго кіраўніцтва вельмі плённа займаецца прамоўшнам уласнай прадукцыі на фестывалях, у прэсе, і гэта выклікае павагу. Шчыра кажучы, не заўважаў, каб кінастудыя займалася нечым падобным у дачыненні да дакументальнага кіно, ды так паспяхова. Можа быць, пасля далучэння "Белвідэацэнтра" што-небудзь і зменіцца — "Летапіс" таксама пачне актыўнічаць, — але пакуль гэта толькі меркаванні.

Яшчэ адзін момант — фінансаванне дакументальнага кіно. Калі пры аб'яднанні колькасць сродкаў, што выдаткоўваецца на прадукцыю "Летапісу" і "Белвідэацэнтра", застанецца той жа, захаваецца тая ж колькасць адзінак і рэжысёры будуць мець той жа аб'ём працы, — гэта будзе добра. Калі ж у выніку зліцця нейкім чынам скароціцца і фінансаванне — гэта значыць, церпіць беларуская дакументалістыка. Бо тое, што робяць "Летапіс" і "Белвідэацэнтр", — гэта розныя рэчы. Дакументальнае кіно і так не спешчана ўвагай, а атрымліваецца, што яно яшчэ больш губляе. А што ёсць дакументальнае кіно, як не ўнёсак у беларускую культуру? Значыць, губляе і культура…

Антон СІДАРЭНКА, кінакрытык:

— Лічу, што разнастайныя плюсы гэтай рэформы будуць перакрыты галоўным мінусам — спыненнем існавання такой актыўнай творчай адзінкі, як "Беларускі відэацэнтр". Плюсы — гэта пэўная эканомія сродкаў. Мінус — страта калектыву, які, на маю думку, не здолее захавацца ў выніку зліцця. "Белвідэацэнтр" — адзіная з дзяржаўных кінаарганізацый, якая існуе па сучасных прынцыпах арганізацыі вытворчасці. Гэта адмысловы творчы цэнтр, дзе творчыя адзінкі — пэўнае кола аўтараў — працуюць па-за штатам, што дазваляе быць гнуткім у вытворчасці кіно. Ці захаваюцца гэтыя аўтары, увогуле, падобны прынцып арганізацыі працы, калі "Белвідэацэнтр" увойдзе ў іншую структуру, дзе пакуль дзейнічае зусім іншая сістэма?

Ды і галоўнае: у адпаведнасці з "Канцэпцыяй развіцця кінематаграфіі Рэспублікі Беларусь на 2009 — 2014 гады", адобранай Прэзідэнтам нашай краіны, адной з асноўных задач развіцця айчыннай кінематаграфіі з'яўляецца стварэнне канкурэнтнага асяродка. Наўрад ці аб'яднанне "Белвідэацэнтра" і кінастудыі "Беларусьфільм" будзе садзейнічаць павелічэнню канкурэнцыі ў нашым дакументальным кіно. Зрэшты, асноўныя высілкі "Беларусьфільма" сканцэнтраваны на вытворчасці ігравых стужак, і губляць вытворцу дакументалістыкі з 20-гадовым стажам вельмі шкада…

Вяртаючыся да надрукаванага

Прачытаўшы артыкул "У Беларусі не патрэбны чытальныя залы на вуліцы?" (газета "Культура" № 27 за 2013 г.), захацелася падзяліцца вопытам работы, якая вядзецца ў гэтым кірунку ў Магілёве. Тым больш, што горад сёлета абвешчаны Культурнай сталіцай Беларусі і СНД. А прасоўванне кнігі, культуры чытання — як ніколі актуальнае.

Пра надзённае. І пра вечнае...

У Беларусі не патрэбны чытальныя залы на вуліцы?

Магілёў, які чытае пад парасонам

Штогод Цэнтральная гарадская бібліятэка імя К.Маркса выходзіць на пляцоўкі горада, знаёміць магіляўчан са сваімі фондамі: на Дзень горада, Дзень бібліятэк. Сёлета супрацоўнікі падрыхтавалі творчы праект «Лета пад кніжным парасонам», у рамках якога працуе выязная чытальная зала на летніх пляцоўках горада: у Камсамольскім скверы і скверы 40-годдзя Перамогі. Тут заўсёды гуляюць матулі з дзецьмі, пенсіянеры.

Два разы на тыдзень з 11-й да 14-й гадзіны магіляўчане маюць магчымасць схавацца ад летняй спёкі пад парасонам ды азнаёміцца з навінкамі беларускай і расійскай прэсы. Тут жа працуе добра вядомы магіляўчанам буккросінг: можна абмяняць кнігу, якую ўжо прачытаў і больш чытаць не будзеш, на тую, што табе спадабалася.

6 ліпеня адбылося ўрачыстае адкрыццё чытальнай залы пад парасонам. Прэм'ерны дзень акцыі гараджане сустрэлі з цікавасцю. Бібліятэкары ў фірменных футболках і кепках запрашалі магіляўчан да чытання. Актыўны ўдзел у акцыі прыняў Кніжны дом "Талака", які ласкава прадаставіў свае выданні ў якасці падарункаў усім, хто запісваецца ў бібліятэку. Цікавасць рэпарцёраў рэгіянальнага тэлеканала зрабіла добрую рэкламу і бібліятэцы, і яе рабоце пад парасонам. Тут заўсёды шматлюдна. Чытальная зала на пляцоўках абласнога цэнтра будзе працаваць да канца жніўня.

Алена АСТАПАВА,
загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі ЦГБ імя К.Маркса Магілёў

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы! Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by,
тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на
www.facebook.com/kimpressby, www.vk.com/kimpressby, www.twitter.com/kultura_by!

Дзяжурны па нумары

Інтэрактыў не прапаноўваць?

Надзея БУНЦЭВІЧ,
рэдактар аддзела газеты "Культура"

На пачатку ліпеня на пешаходнай вуліцы Карла Маркса стартаваў Мінскі форум вулічных тэатраў, які завершыцца ў верасні ў Дзень горада. Першыя выступленні, вылучаныя для далейшага адбору фіналістаў, шчыра кажучы, збянтэжылі. Найперш тым, што ўдзельнікі, так бы мовіць, "не зусім" разумеюць, што ж такое вулічны тэатр увогуле.

Паводле задумы арганізатараў (а заснавальнікамі праекта выступілі Мінгарвыканкам і адміністрацыя Ленінскага раёна сталіцы), удзел у форуме могуць прымаць прафесійныя ды аматарскія тэатры з любымі жанрамі вулічнага мастацтва: пантаміма, кантактная імправізацыя, лялькі, ролевыя, танцавальныя гурты, вулічныя паэты, фокуснікі і г. д. Здавалася б, які разгорт! Ажно не. Тратуар чамусьці трактуюць як акадэмічную сцэну, а праезную частку — як чынны партэр.

Прывяду прыклад. Адзін з танцавальных тэатраў выступае з нумарам, дзе двое хлопцаў увасабляюць, скажам так, не зусім цвярозых маладых людзей. Публіка ўсміхаецца іх няцвёрдаму поступу, хістанням з боку ў бок, іншым выхадкам, што знешне выглядаюць дастаткова імправізацыйна. І раптам у той "сцэнічнай прасторы" з'яўляецца бабуля. Самая простая. Не "падстаўная". З мінакоў. Ну ішла сабе па тратуары, а тут раптам — нейкія танцоры. Яна, вядома, прытармазіла ад разгубленасці, не ведае, куды ёй далей рушыць: ці то наперад (а раптам яе там "падпітыя" затопчуць?), ці то назад (але ж гэта неяк развярнуцца-размінуцца яшчэ трэба!). Бедная старая пачала ў "артыстаў" нават штосьці распытваць. Пад сапраўдны рогат публікі, бо выглядала гэта папраўдзе камічна — кіно, дый годзе! Вось, здаецца, сам лёс ідзе насустрач "тэатралам"! І не марылі пра інтэрактыў, а тут — калі ласка, ды яшчэ які! Дый гледачы гатовы "ўцягнуцца", бо чужы прыклад заўсёды заразлівы. Ажно не. Хлопцы зірнулі на бабулю, "зморшчыліся" ў душы (замінае старая, аднак!) — і прадоўжылі, як ні ў чым ні бывала, "адпрацоўваць" свой пастаўлены і адрэпеціраваны нумар. Але ж вулічны тэатр пачынаецца менавіта з разбурэння падзелу на сцэну і залу, артыстаў і гледачоў!

> "Чыстае мастацтва" на вуліцах у нас пакуль не прыжываецца. З аднаго боку замінае высокі пастамент з традыцыяй. З другога — забавы "ні розуму ні сэрцу". Пасярэдзіне — нічога. Шкада!

Дарэчы, у руках танцоры трымалі бутэльку, часам перакулялі яе — быццам пілі штосьці. Ім відавочна не хапала трэцяга! Чаму б не пашукаць яго сярод прысутных? А ў бутэльку і сапраўды наліць — не гарэлку і не піва, а тую ж салодкую ваду! Бо і "без градусаў", і без абавязковага "Пі да дна!" (усім піць з адной бутэлькі, як сведчыць медыцына, негігіенічна) адразу стане весела. І нумар будзе прадоўжыцца не тры хвіліны, а столькі, колькі публіка згодна ў ахвоту падтрымліваць тую гульню. Тым больш, што адразу просіцца і працяг "сюжэта": з'яўленне "вуліцыянера" ў форме, які пачне цікавіцца "змесцівам-зместам" бутэлькі, бо, як вы разумееце, распіваць (і нават адкрываць!) спіртное на вуліцы забаронена. Калі публіка не адразу ўцяміць, дзе праўда, а дзе розыгрыш, дык можна канстатаваць, што "спектакль удаўся".

Ці, можа, нас усіх так напужалі флэшмобамі, што збочыць управа-улева ад зададзенай (і праверанай у інстанцыях) траекторыі мы ўжо не здольныя? Флэшмоб, дарэчы, таксама можа лічыцца адным з адгалінаванняў вулічнага тэатра. Толькі не трэба блытаць мастацтва з палітыкай! Але, падобна на тое, "чыстае мастацтва" ў нас пакуль не прыжываецца. Можа, таму што не навучыліся цаніць эстэтычнае задавальненне? У нас жа на адным полюсе — "трэба", а не "хочацца", на другім — "хочацца, ды нельга". З аднаго боку — высокі пастамент з традыцыйнасцю, з якой нельга здзерці пакрыты пылам стагоддзяў парык. З другога — забавы з разраду "ні розуму ні сэрцу". А пасярэдзіне — нічога. Шкада! Бо калі мы навучымся спалучаць адно з другім, дык, пэўна, жыць будзе куды весялей. І ўсмешкі самі з'явяцца на нашых тварах — не толькі ў час камедый, калі "смяяцца трэба", але і проста ад паўнаты жыцця, якая не вымяраецца паўнатой кішэняў…

Пакуль жа — адборы працягваюцца, кожныя два тыдні па выхадных. Ёсць час праявіць сябе!..

Паядынак фармату з

XXII Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" прайшоў у новым фармаце. Але ж само слова "фармат", этымалогія якога звязана са "знешнім выглядам", шмат у чым спрэчнае для мастацтва. Дык чым жа скончыўся паядынак фармату з навізной?

Новае — незабыўнае старое

Сёлетні фестываль, падобна на тое, аспрэчыў даўно вядомую формулу: "Новае — даўно забытае старое". Бо ягоная навізна мела, хутчэй, іншае паходжанне: новае — лепшае старое, толькі тлуста падкрэсленае. Не адмаўлялі гэтага і самі арганізатары. Дарэчы, іх уяўленне пра навізну таксама змянілася. Калі на прэс-канферэнцыі адкрыцця акцэнт усё ж рабіўся на слове "новы", дык перад яго закрыццём дырэктар фестывалю Аляксандр Сідарэнка не стамляўся падкрэсліваць, што ўлічваліся напрацоўкі і новае нараджалася як працяг лепшых традыцый.

Сапраўды, рэзка змяніць курс, калі ў сусветным фестывальным руху ўсё распісана на гады наперад, папросту немагчыма. І ці трэба выплёскваць з вадою дзіця? Паступовая эвалюцыя — найлепшы прынцып развіцця. Дык што ж было захавана і што — знойдзена?

Станьце, фэсты, у карагод!

Фармулёўка "фестываль фестываляў" у дачыненні да "Славянскага базару..." з'явілася даўно: яшчэ тады, калі ён увайшоў у Міжнародную федэрацыю фестывальных арганізацый — FIDOF — і быў прызнаны там не проста на роўных, а адным з "самых-самых". Праходзіў у Віцебску і "круглы стол" арганізатараў фестываляў (2004 г.), прыязджаў да нас і Генеральны сакратар FIDOF, каб уручыць Прэзідэнту нашай краіны Аляксандру Лукашэнку, пад чыім патранам ладзіцца віцебскі форум, медаль "За значны ўнёсак у развіццё міжнароднага сусветнага руху" (2005 г.), неаднаразова праводзіліся і канцэрты ўдзельнікаў "Еўрабачання". Таму цяперашні працяг гэтай лініі цалкам заканамерны. Тут і "Прывітанне з Сан-Рэма", запланаванае яшчэ летась, і падкрэсліванне таго, што ледзь не кожны госць цяперашняга фэсту — пераможца ці ўдзельнік вядомых форумаў, ад якіх ён і прывёз сваё прывітанне.

Між тым, яшчэ больш плённай пазіцыяй здаецца супрацьлеглая: "Нашы зоркі — у свет". Сёлета яна найбольш ярка выявілася ў складзе журы абодвух конкурсаў, куды былі запрошаны многія пераможцы мінулых гадоў (гл. "К" № 28 за 2013 г.). Падтрымліваць сувязі трэба, дарэчы, не толькі з лаўрэатамі. Вельмі прыемна было пачуць, да прыкладу, нашага Яўгена Славіча, якому летась зусім крыху не хапіла да лаўрэацтва (ну пашкадавала тады журы дзяліць прэміі!). Але ж сам Яўген сябе не шкадаваў. І, саліруючы з Прэзідэнцкім аркестрам у адметным сімфарокавым канцэрце "Дым над вадой", выдаваў такія сола, што была зразумела: перад намі — пераможца калі не конкурсу, дык сябе самога, таленавіты і вельмі прафесійны спявак, які за год зрабіў як за пяць!

Раней фестываль таксама імкнуўся запрасіць у віцебскае гняздзечка сваіх птушанят. Так і трэба: максімальна пірыць падобныя вяртанні "незнаёмых знаёмцаў" на новых вітках іхняй творчай кар'еры. Адсочванне лёсу сваіх выхаванцаў, падкрэсліванне, які добры старт дала ім беларуская зямля і Віцебск, можа мець вялікае не толькі мастацкае, але і палітычнае значэнне.

> **Замест рэзкай змены курсу —** планамерная эвалюцыя і, нарэшце, паварот да гледача

Канцэрт для сола з парытэтам

Пошук новых імёнаў актуальны для любога фестывалю. Ёсць форумы, якія прынцыпова не запрашаюць калектывы двойчы. А што ў нас? З аднаго боку, глядач ідзе на "праверанныя" імёны. З іншага ж — наўрад ці штогод ён будзе рады аднастайнасці, асабліва сольнікаў, якіх сёлета стала больш, а гала-канцэртаў — менш. І хаця гэта тлумачылі формулай "Зорнасць фестывалю падкрэсліваюць сольнікі зорак", разлік тут насамрэч — фінансавы. І выбар імёнаў павінен быць больш прыдзірлівым. Калі артыст "расце", робіць відавочныя крокі наперад — запрашаць. Калі ж вязе ўсё тыя ж песні, хіба ў іншай паслядоўнасці, — дык навошта?

Той жа Дзіма Білан, які, здавалася б, зусім нядаўна валадарыў на віцебскай плошчы Перамогі, выдаў сёлета шыкоўны творчы вечар (дакладней, ноч). З новай праграмай выступіла Алена Ваенга. А вось Аляксандр Малінін — паўтарыў свае "былыя заслугі". Вылучаўся сярод сольнікаў вечар Ларысы Долінай: не толькі спалучэннем класічнага блока з джазава-эстрадным, але і выдатным парытэтам "двух салістаў", дзе яшчэ не вядома, хто быў першым: спявачка ці Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі на чале з народным артыстам краіны, прафесарам Міхаілам Фінбергам. Яшчэ адзін "партрэтна-парытэтны" варыянт уяўляў з сябе падвойны сольнік дзвюх сямейных пар — Анжалікі Варум з Леанідам Агуціным і Наталлі Падольскай (нагадаем, былой магіляўчанкі, узрошчанай на "Залатым шлягеры..." і "Славянскім базары...") з Уладзімірам Прасняковым. Такія балансаванні канцэрта паміж сола і гала- уяўляюцца вельмі перспектыўнымі. Кожны артыст атрымлівае па некалькі выхадаў ці хаця б нумароў — тое, што трэба.

Вяртаючыся да надрукаванага

Бровар і млын: чый лёс незайздросны?

новага навізной

Праўда, і тут патрэбны дасканалы папярэдні адбор. На сёлетнім фестывалі відавочна не шанцавала на добры гумар — "небарадаты" і не "ніжэй пояса". Праблескамі былі "Экс-ББ" са сваёй спеўнай класікай у "Парадзе ўсмешак" і 20-гадовы парадыст Андрэй Барынаў з адметным шоу, прымеркаваным менавіта да "Славянскага базару...", у канцэрце закрыцця.

Ваш ход, спадар рэжысёр!

Значна палепшыліся трансляцыі Белтэлерадыёкампаніі, якая больш поўна, чым іншыя, адлюстроўвае фестывальныя канцэрты. Больш прыцягальнай стала "карцінка", чаго так доўга дабіваліся арганізатары фестывалю. Гэта адбылося і за кошт больш сучаснага сцэнічнага абсталявання, і дзякуючы вопыту саміх тэлевізійшчыкаў. А дадатковае рэдагаванне канцэртаў, якія ішлі ў запісе, спрыяла і самой драматургіі, і мастацкаму ўзроўню: нешта скарачалася, нешта перастаўлялася месцамі — дарэчы, вельмі ўдала.

Хаця неаднаразова падкрэслівалася, што разлік сёлета рабіўся менавіта на "экраннае" ўспрыняцце, не былі пакрыўджаны пры гэтым і самі гледачы Амфітэатра. Праўда, не толькі самі канцэрты, але і сцэнічныя эфекты з залы і ў тэлеверсіі (ды яшчэ з розных ракурсаў) успрымаліся, як заўсёды, па-рознаму. З Амфітэатра кідаліся ў вочы паралелі з "Новай хваляй", уголас заўважаныя на адной з прэс-канферэнцый дзецьмі — навучэнцамі Рыжскай дзіцячай акадэміі тэлебачання і радыё. На тэлеэкране ж іх зусім не было відаць: зліваючыся з астатнімі святлодыёднымі экранамі, яны ўсяго толькі дадавалі крыху аб'ёмнасці. Праўда, не заўсёды выкарыстоўваўся шырока разрэкламаваны прынцып: кожнай песні — свая сцэнаграфія. Некаторыя "карцінкі" паўтараліся хаця б не на працягу аднаго канцэрта, а ў розных. На новы віток выйшла і рэжысура конкурсаў, асабліва дзіцячага (гл. "К" № 28 за 2013 г.).

А вось у закрыцці, дзе "чаравала" крэатыўная віцябчанка Марына Раманоўская, былі відавочныя драматургічныя правалы: што ні кажыце, працаваць з зацверджаным "спісам артыстаў" заўсёды цяжка. А выбудаваць іх выхады ў нейкую канцэпцыйную лінію — практычна немагчыма. Прынцыпова новым было выпрабаванне пераможцаў конкурсу "меднымі трубамі" — гэткім гучна-паказальным уганараваннем спевакоў на балі ў іх гонар. Не хапала хіба пастамента, асабліва пры зусім не двухметровым росце 11-гадовай Прэсіяны Дзімітравай з Балгарыі і 25-гадовага Міхала Качмарака з Польшчы, кожны з якіх апынаўся ў шчыльным коле натоўпу танцораў.

Прэзентацыі з сенсацыяй і паралеллю

Тое, што "Славянскі базар..." усё больш акцэнтуе свой музычны складнік і, найперш, конкурсы, даўно не навіна. Нагадаем, гэты форум увогуле пачынаўся як музычны, арганізаваны вакол "дарослага" конкурсу. Фестывалем мастацтваў ён стаў толькі на чацвёрты год, працягваючы пашырэнне жанравых "тэрыторый" і надалей, пікам чаго можна лічыць 1999 год, калі колькасць фестывальных мерапрыемстваў перасягнула 125. Цяперашняя "аптымізацыя" скараціла гэтую лічбу ўдвая. Але сама змена курсу на інтэнсіфікацыю пачалася раней.

Адмова ад традыцыйных канцэртаў Дзён Беларусі, Расіі, Украіны не толькі скараціла фестывальныя тэрміны (і, яшчэ больш, каштарыс), але і значна павысіла глядацка-журналісцкую ўвагу да так званага "Канцэрта сяброўства". Ён змясціў у сабе "тры ў адным", а таксама прапанаваў многія менавіта фестывальныя дуэты, да прыкладу, нашай цымбалісткі Веранікі Прадзед і расійскага "Церам-квартэта" ды іншых.

Пашырыліся мерапрыемствы Дня моладзі, засталіся ў фестывальным раскладзе "Тэатральныя сустрэчы" і кінапраграма. Вось толькі з рэкламай ва ўсіх было — парознаму. БРСМ піярыў свае праекты ўсімі магчымымі спосабамі. А тэатр і кіно сціпла стаялі ўбаку. Не, у фестывальным буклеце, як і ў афішах, былі пазначаны спектаклі ды фільмы. Але нельга сказаць, каб на іх запрашалі гэтак жа настойліва, як на праявы маладзёжных субкультур. У выніку на яркіх, парадаксальных, глыбокіх "Фотаапаратах" паводле аднайменнай п'есы бліскучага сучаснага драматурга Пятра Гладзіліна ў зале было недаравальна мала публікі. А на куды больш спрэчным, шмат у чым недапрацаваным "Утаймаванні наравістай" таго ж Маскоўскага тэатра на Паўднёвым Захадзе — удвая больш. Бо Шэкспір? Ці таму, што паралельна ішоў больш прыцягальны па назве "Мужчына маёй мары" Маскоўскага тэатральнага цэнтра "Шанс"? Дый білеты былі для Віцебска нятанныя: 280 тысяч рублёў (не будзем параўноўваць з амаль мільённым адкрыццём форуму). Пасля спектакля тыя ж "Фотаапараты" атрымалі на фестывальным сайце добра напісаную рэцэнзію. А чаму б не такі ж заклікальны анонс — напярэдадні?

Не трапілі ў фестывальную праграму віцебскія спектаклі, хаця дэманстраваць было што. Праўда, і "Лялька" і коласаўцы зрабілі свае "паралельныя сусветы": паставілі кожны па два паказы ў фестывальныя дні, хаця і па-за яго рамкамі. Ізноў жа — без рэкламы. А можа, і зацікавіўся б хто?

Тое ж — у фестывальным прэс-цэнтры, дзе на сустрэчу са Златай Огневіч прыйшло максімум з дзясятак прадстаўнікоў СМІ (з акрэдытаваных пяці соцень). І яшчэ запытваліся: маўляў, а хто гэта такая? Ну не ўсе памятаюць прозвішча дзяўчыны, якая сёлета прадстаўляла Украіну на "Еўрабачанні". Мабыць, трэба было пазначыць гэта ў афішы прэс-цэнтра?

Яшчэ больш "другаснай" для грамадскай увагі паўстала (і не першы год, дарэчы) кінапраграма. Праўда, на "Сляды апосталаў" журналістаў паклікалі напярэдадні ў Мінску. У Віцебску ж піяру не было і следу. Пагаджуся, атрымаўся не шэдэўр (больш падрабязны тэлесерыял, з якога і "нарэзалі" кінаверсію, — куды цікавейшы). Але глядзець яго варта хаця б з-за беларускіх артыстаў ды легендарнай гісторыі Нясвіжа.

Дык каму "фестывалім"?

Новы фармат — у дакладным уяўленні адрасата мерапрыемстваў і высокай якасці апошніх. Калі імкненне да "лепшага" і "найлепшага" было ўласціва фестывалю заўсёды, дык першы складнік паступова трансфармуецца. Фестываль нарэшце перайшоў па скіраванасці на гледача — непасрэдна ў залах і, дзякуючы тэлебачанню, ва ўсім свеце. Сёлета ў ім прынялі ўдзел прадстаўнікі 31 краіны, а за часы існавання пабывалі ўдзельнікі з усіх кантынентаў. Значыць, наступным крокам фестывалю павінна стаць больш шырокае развіццё фестывальнага турызму, калі на "Славянскі базар у Віцебску" публіка будзе ехаць не толькі з розных куткоў Беларусі, але і з замежжа. А што для гэтага трэба — ужо асобнае пытанне.

> Фестываль нарэшце перайшоў па скіраванасці на гледача — непасрэдна ў залах і, дзякуючы тэлебачанню, ва ўсім свеце.

Надзея БУНЦЭВІЧ,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Віцебск — Мінск

Ізноў пра помнікі **ды іх шансы на выжыванне**

У "К" № 26 мы пісалі пра лёс помнікаў спадчыны ў Вілейскім раёне. Новыя перспектывы, нагадаем, адкрыліся, у тым ліку, і дзякуючы новаму турыстычнаму маршруту па шляхах паўстанцаў 1863 года. Так, мы ўжо згадвалі, што ў колішні бровар у Стайках (кадры на стар. 4) актыўна інвестуюцца сродкі для ажыццяўлення яго рэканструкцыі. Таму тут — агароджа, вартаўнік, паўсюдна будаўнічыя рыштаванні. А вось млын у Мацькаўцах (фота ўнізе), што за якія пару кіламетраў ад названага аб'екта, пакуль вітае вандроўнікаў і мясцовых жыхароў усё тымі ж забітымі шыбамі. Пераканацца ў гэтым дазволілі фота, якія мы атрымалі ад нашых чытачоў, што вырашылі прайсці частку маршрута, апісанага ў газеце.

На маю думку...

Выстаўкі і "экспарт": артэфакты альбо традыцыі?

Алег РЫЖКОЎ,
генеральны дырэктар
Нацыянальнага гістарычнага
музея Рэспублікі Беларусь

Як вядома, Нацыянальны гістарычны музей мае надзвычай багатыя фонды — несувымерна большыя, чым нашы цяперашнія экспазіцыйныя магчымасці. І ў такой сітуацыі цалкам лагічна зрабіць асаблівы акцэнт на арганізацыю выставак за мяжой. Тым больш, гэта цалкам адпавядае стратэгічнай задачы нашага музея — папулярызацыі беларускай гісторыі і культуры.

Задзел для правядзення такіх выставак ужо створаны: мы маем неблагія кантакты з шэрагам музейных устаноў у іншых краінах. Але, вядома, тут адразу ўзнікае пытанне: якія тэмы, прадметы, падыходы здатныя зацікавіць абазнанага замежнага гледача? Прасцей кажучы, што паказваць?

Першы варыянт адказу, які прыходзіць у галаву, — везці самае дарагое, што ў нас толькі ёсць. Дарагое менавіта ў матэрыяльным эквіваленце. Але маючы стасункі з замежнымі калегамі, я неаднаразова пераконваўся: такім чынам поспеху мы не дасягнем. Каштоўныя артэфакты, якія часам нават наўпрост і не тычацца беларускай гісторыі ды культуры, — зусім не тое, чым мы можам здзівіць ды ўразіць аўдыторыю ў іншых краінах. Тым больш, для іх гэта звыкла: часам людзі нават у сваіх дамах карыстаюцца антыкварнай мэбляй або посудам XIX стагоддзя. І таму рабіць акцэнт у сваёй выставачнай палітыцы на дарагіх прадметах я лічу памылковым.

> Даўно пераканаўся: наведвальнікі музеяў у любой краіне прагнуць убачыць перадусім нешта новае, самабытнае, не ўласцівае сваёй культуры. Няўжо ж нам няма чаго паказаць?

Даўно пераканаўся ў тым, што наведвальнікі музеяў у любой краіне прагнуць убачыць перадусім нешта новае, самабытнае, не ўласцівае сваёй культуры. Няўжо ж нам няма чаго паказаць? Тым больш, многія замежнікі пакуль не надта дэталёва разумеюць, адкуль бяруцца вытокі нашай нацыянальнай ідэнтычнасці, а разам з ёю — і дзяржаўнасці. І прыярытэтнай задачай сваёй установы я лічу фармулёўку той лініі, якая выяўляла б адказы на ўсе гэтыя пытанні з дапамогай музейных сродкаў.

Калі замежны глядач навучыцца "расшыфроўваць" арнаменты нашых ручнікоў, калі ён азнаёміцца з традыцыйнымі абрадамі і рамёствамі, дык, напэўна, самастойна прыйдзе да высновы, што беларускі народ — сапраўды ўнікальны ды самабытны. І развіваючыся ў цесным узаемадзеянні з культурамі сваіх суседзяў, ён ішоў праз стагоддзі ўсё ж уласнымі гістарычнымі пуцявінамі, якія лагічным чынам прывялі да з'яўлення незалежнай дзяржавы.

Безумоўна, выставачныя праекты ні ў якім разе нельга абмяжоўваць той або іншай тэматыкай — яны павінны быць шматграннымі. Як, зрэшты, і сама культура індывідуума або народа, што ахоплівае яго жыццё на ўсіх узроўнях — ад сакральнага да паўсядзённага. Можна казаць пра культуру вытворчасці, зносін, урэшце, кулінарыі... І ва ўсіх гэтых сферах беларусы маюць свае адметнасці, цікавыя свету.

А калі мы будзем проста выводзіць нашы фонды, што збіраюцца "са свету па нітцы", атрымаюцца безаблічныя праекты, якія згубяцца ў агульнай масе тых шматлікіх культурных падзей, што ладзяцца ў любым буйным замежным горадзе і ніколі не выклічуць сур'ёзнай цікавасці замежнага гледача. Лічу, такія ініцыятывы не маюць вялікага сэнсу.

Культурная дыпламатыя і міжнародныя праекты ў канкрэтных прыкладах

Разнастайныя алгарытмы сяброўства

Намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Васіль ЧЭРНІК быў прызначаны на дадзеную пасаду зусім нядаўна, але ж гэтую асобу наўрад ці трэба прадстаўляць работнікам галіны. Раней Васіль Мечыслававіч доўгі час узначальваў упраўленне ўстаноў культуры народнай творчасці, займеўшы ва ўсіх рэгіёнах Беларусі трывалую рэпутацыю ініцыятыўнага ды руплівага кіраўніка. Ды і чатыры гады, праведзеныя на дыпламатычнай службе, таксама былі ў значнай меры прысвечаны культуры: працуючы ў Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча, ён курыраваў пытанні гуманітарнага супрацоўніцтва паміж нашымі дзяржавамі. Адпаведна, звышважную тэму "экспарту" айчыннага мастацтва за межы краіны Васілю Чэрніку давялося засвоіць, што называецца, "у палявых умовах".

— Ведаеце, пад час майго чатырохгадовага знаходжання ў Польшчы нам даводзілася прымаць арганізацыйны ўдзел у правядзенні на яе тэрыторыі каля 200 беларускіх культурных мерапрыемстваў: канцэртаў, выставак, сустрэч з пісьменнікамі…

— За ўвесь час?

— Што вы, гэта я назваў сярэднюю лічбу за год! Дык вось, цікавячыся ўражаннямі наведвальнікаў (а ў іх ліку былі і вельмі паважныя асобы — напрыклад, акрэдытаваныя ў Польшчы дыпламаты), амаль кожны раз я чуў прыблізна наступнае меркаванне: для таго, каб скласці сваё ўражанне пра краіну, лепш за ўсё грунтоўна пазнаёміцца з яе культурай. Значыць, гэты алгарытм пазіцыянавання дзяржавы за мяжой і сапраўды эфектыўна працуе. У нашу задачу ўваходзіла паказаць найлепшыя здабыткі айчыннай культуры, выявіць яе духоўную глыбіню ды шматгранасць.

— У апошнія гады рэгулярна ўзнікаюць дыскусіі: а якія менавіта праявы беларускага мастацтва здатныя годна прадставіць за мяжой краіну? Што цікава тамтэйшай аўдыторыі?

— Як вы самі разумееце, адназначнага адказу на гэтае пытанне проста не можа быць. Натуральна, у любой краіне глядацкая аўдыторыя — неаднародная, яна мае розныя ўпадабанні. Ды пэўныя тэндэнцыі ўсё ж прасочваюцца. Прыкладам, у Польшчы вялікім попытам карыстаецца наша народнае мастацтва. Часам арганізатары таго або іншага фэсту прасілі нас прывезці да іх ледзь не любы народны калектыў, бо ведалі, што ўзровень нашых аматарскіх ансамбляў — вельмі высокі і публіка будзе доўга апладзіраваць.

Асаблівы попыт — на беларускія харэаграфічныя калектывы. Пры ўсім прафесіяналізме польскіх танцораў, без лішняй сціпласці мушу адзначыць, што нашы — на галаву вышэй. Вось і тыднёвыя гастролі ў Польшчы знакамітых "Харошак" прайшлі на ўра...

— А ў якіх рэгіёнах Польшчы яны адбываліся? Бо адна справа — Беласточчына ды Падляшша, дзе жыве нямала нашых суайчыннікаў, а зусім іншая — Памор'е на мяжы з Германіяй…

— Тут не паспрачаешся. І, натуральна, такую спецыфіку сацыяльна-дэмаграфічнага складу насельніцтва краіны-суседкі мы абавязкова павінны ўлічваць у сваёй дзейнасці. Паводле апошняга перапісу, які адбыўся летась, ва ўсходніх рэгіёнах Польшчы жыве больш за 47 тысяч этнічных беларусаў. І многія нашы мерапрыемствы былі разлічаны менавіта на гэтую аўдыторыю, стаўшы сведчаннем той увагі, якую надае наша дзяржава суайчыннікам за мяжой. Зрэшты, і яны самі ахвотна аказваюць нам неацэнную арганізацыйную дапамогу. Асабліва хацелася б падзякаваць Беларускаму культурнаму таварыству ў Беластоку, якое ўжо не першае дзесяцігоддзе з'яўляецца дзейсным каталізатарам культурнага жыцця свайго краю.

Але вернемся да вашага пытання… Самае цікавае, што "Харошкі" гастралявалі менавіта ў тых мясцінах, дзе этнічных беларусаў амаль няма: Людзь, Петркаў-Трыбунальскі… Многія наведвальнікі канцэртаў упершыню змаглі пазнаёміцца і з беларускай прафесійнай сцэнай, і з тым народным фальклорам, якім яна ў значнай меры сілкуецца. На сённяшні дзень наша асноўная задача — распаўсюдзіць арэал прысутнасці беларускай культуры ў Польшчы за межамі яе ўсходніх рэгіёнаў. Таму імпрэзы ладзіліся і ў Заходне-Паморскім, і ў Любускім ваяводствах, ва Уроцлаве, у Кракаве, Гданьску, Калобжэгу… А таксама і ў Варшаве, дзе проста насупраць будынка Урада прайшла вулічная выстаўка "Art-Zabor". Тэатральная публіка не раз выклікала на біс "купалаўцаў" з іх "Пінскай шляхтай" ды артыстаў Нацыянальнага тэатра оперы і балета, якім давялося выступаць на самай прэстыжнай опернай сцэне Польшчы...

— А ці ёсць цікавасць у Польшчы да больш сучасных форм нашай культуры — скажам, поп-музыкі?

— Правесці гастролі ў Польшчы нашых эстрадных выканаўцаў, прызнацца, куды складаней: іх там мала хто ведае. Ёсць, вядома ж, і выключэнні. Прыкладам, пасля таго, як Ірына Дарафеева атрымала Гран-пры на прэстыжным Міжнародным фестывалі ў Зялёнай Гуры, з'явілася магчымасць зладзіць яе выступленні ў горадзе Шчацінку. Адпаведна, ініцыятыва ў значнай меры павінна зыходзіць ад саміх выканаўцаў.

— Зразумела, што культурныя стасункі паміж суседзямі вымагаюць асаблівай увагі, але ці мае беларускае мастацтва шанец "прагучаць" і ў краінах, далёкіх ад нашых межаў?

— Сапраўды, нас з Польшчай звязвае ладны перыяд супольнай гісторыі, пэўная блізкасць у культуры ды менталітэце. Іншая справа — Азербайджан, які ад Беларусі аддзяляе адлегласць у некалькі тысяч кіламетраў. Але каб вы толькі бачылі, з якім энтузіязмам прымалі нашых артыстаў цягам нядаўніх Дзён беларускай культуры! Пад час іх адкрыцця зала Дзяржаўнай філармоніі імя Муслі ма Магамаева ў Баку была поўнай, аншлагі нас чакалі і ў гарадах Хачмаз і Мардакян, дзе таксама праходзіла акцыя. Прычым публіка добра сустракала не толькі сваю зямлячку Гюнеш Абасаву або салістаў Нацыянальнага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь — нашы народныя песні ў выкананні ансамбля "Свята" выклікалі сапраўдны шквал авацый! І гэта, на маю думку, цалкам вытлумачальна: спакушаны глядач умее цаніць талент ды прафесіяналізм і з цікавасцю адкрывае для сябе культуры іншых народаў.

> Досвед Беларусі ў ахове і заахвочванні разнастайнасці форм культурнага самавыяўлення ацанілі: краіна была выбрана ў Міжурадавы камітэт UNESCO па культурнай разнастайнасці. А на 12 месцаў новых членаў прэтэндавала 118 краін!

Зрэшты, нельга забываць і пра тое, што з Азербайджанам нас таксама лучыць вельмі важны перыяд сумеснай гісторыі. Арганізоўваючы паказ фільма "Брэсцкая крэпасць", які адкрываў Дні беларускага кіно ў Баку, мы звярнулі ўвагу на тое, што сярод абаронцаў Цытадэлі было нямала азербайджанцаў, многія там гераічна загінулі… І з дапамогай Пасольства Рэспублікі Беларусь у гэтай краіне нам удалося адшукаць іхніх дзяцей ды ўнукаў і запрасіць іх на прэм'еру.

— Але Дні культуры, як і ўсе святы, бываюць нячаста. А як выглядае, так бы мовіць "будзённы" фармат супрацоўніцтва?

— Акурат пра гэта і вялася гутарка пад час нашай сустрэчы з міністрам культуры і турызму Азербайджанскай Рэспублікі Абульфасам Караевым, кіраўнікамі найбуйнейшых устаноў культуры краіны. І такія сустрэчы маюць зусім не толькі фармальны, "пратакольны" характар — так і ствараецца глеба для канкрэтных праектаў. Пра ўсе напрацоўкі казаць пакуль, мабыць, зарана, але агучу хаця б адну.

На пачатку снежня ў Баку адбудзецца VIII Сесія Міжурадавага камітэта UNESCO па захаванні нематэрыяльнай спадчыны, на якой нашай краіне належыць трымаць разгорнутую справаздачу пра свае захады па выкананні адпаведнай канвенцыі. І вось, з'явілася ідэя не толькі правесці невялічкую фотавыстаўку, якая фіксуе нашы элементы НКС, але і дазволіць непасрэдна спрычыніцца да аднаго з іх, запрасіўшы ў Баку невялічкі аўтэнтычны калектыў з беларускай вёскі.

— Беларусь актыўна далучаецца да ўсіх ініцыятыў UNESCO. Ці ацэнены наш досвед экспертамі гэтай арганізацыі?

— 13 чэрвеня ў Штаб-кватэры UNESCO ў Парыжы прайшла IV Сесія канферэнцыі па пытаннях прымянення Канвенцыі аб ахове і заахвочванні разнастайнасці форм культурнага самавыяўлення. Досвед Беларусі ў гэтай галіне міжнародныя эксперты ацанілі высока, і як вынік — наша краіна была выбрана ў склад Міжурадавага камітэта UNESCO па культурнай разнастайнасці. Варта адзначыць, што канкурэнцыя была вельмі вялікая: на 12 месцаў новых членаў прэтэндавала 118 краін!

Зрэшты, гэты візіт у Парыж атрымаўся выніковым адразу па некалькіх прычынах. Разам з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Францыі, пастаянным прадстаўніком Беларусі пры UNESCO Паўлам Латушкам мы вялі перамовы з намеснікам гендырэктара UNESCO Янісам Каркліншам па пытаннях падрыхтоўкі намінацыйных дасье дакументальнай спадчыны і ўключэння беларускіх крыніц у рэестр "Памяць свету". UNESCO гатова аказаць нам садзеянне ў гэткай складанай ды карпатлівай справе, але папярэдне мы павінны самі вызначыць патэнцыйных "кандыдатаў". Дарэчы, абмеркавалі мы і пытанні адзначэння 60-х угодкаў членства Беларусі ў UNESCO. Спадзяюся, гэты юбілей станецца для нас нагодай прэзентаваць у Парыжы часцінку сваёй культуры, прычым непасрэдна ў Штаб-кватэры прадстаўнічай міжнароднай арганізацыі.

— Міжнародныя стасункі патрэбны нашым установам культуры і для вывучэння досведу. Ведаю многіх кіраўнікоў, якія пасляхова яго "імпартуюць" — ці, наадварот, вучацца на чужых памылках…

— Думаю, вучыцца ўсё ж лепш на чужых дасягненнях. Менавіта пра гэта вялася гутарка пад час парыжскай сустрэчы з генеральным дырэктарам Міністэрства культуры Францыі (гэтая пасада прыкладна адпавядае намесніку міністра) Вінсентам Бержо, удзел у якой узяў Павел Паўлавіч і я. Адно з навайжнейшых пытанняў — магчымасць стажыроўкі дырэктараў найбуйнейшых беларускіх музеяў у вядучых музеях Францыі. Лішне нават казаць, што гэтая дзяржава — у ліку сусветных лідараў у дадзенай галіне. У выніку наша прапанова была адобрана, і, спадзяюся, рэалізуецца ўжо ў самым хуткім часе.

— Без сумневу, вельмі важнае значэнне мае таксама развіццё гарызантальных міжнародных сувязей — паміж муніцыпальнымі ўладамі, а таксама канкрэтнымі ўстановамі...

— Думаецца, у гэтай справе прагрэс у нас — таксама навідавоку. Здаралася, прыязджаеш ты ў той або іншы польскі гарадок, і яго мэр кажа: дык у нас вось акурат нядаўна ўжо была дэлегацыя з Беларусі, ды і свае творчыя калектывы яна, вядома, прывозіла! І гэты рух сяброўства, які ніякім чынам не магчыма інспіраваць "зверху", з дапамогай адміністратыўнага рэсурсу, сапраўды імкліва развіваецца. Бывала, у беларускае пасольства ў Варшаве звярталіся прадстаўнікі ўлад таго або іншага населенага пункта Польшчы ды прасілі: знайдзіце нам беларускага пабраціма! Адпаведна, сябраваць з намі і сапраўды хочуць...

Пытанні задаваў Ілья СВІРЫН
Фота Юрыя ІВАНОВА

Мы выбіраем, нас выбіраюць...

Міжнародны конкурс эстрадных выканаўцаў "Віцебск-2013" падвёў вынікі ў дзень закрыцця фестывалю. Гран-пры паехаў у Польшчу, наш Аляксандр Салаўёў падзяліў Трэцюю прэмію. Усё цудоўна? Але паразважаць ёсць над чым.

Амерыканскія горкі?

Па колькасці рэзкіх перападаў слухацкіх уражанняў — то ўверх, то ўніз — конкурс ці не ўпершыню за ўсе гады свайго існавання нагадваў амерыканскія горкі, захоўваючы інтрыгу ды непрадказальнасць з пачатку і да самага канца.

Інтрыга ўзнікла яшчэ на ўзроўні складу ўдзельнікаў. Бо калі дзяўчат 8, а юнакоў — ажно 13, дык гэта ўжо само па сабе некаторае "выключэнне з правілаў". Праўда, на "Славянскім базары..." ды на іншых конкурсах апошнім часам такое ўжо не рэдкасць. Новая тэндэнцыя? Чакаць яе можна было ўжо тады, калі ўзнімалі ўзроставую планку конкурсу — да 31 года ўключна. Адпаведна, рэзка павялічылася колькасць канкурсантаў, якім "за 25" (тым больш, што больш маладзейшыя могуць без цяжкасці знайсці безліч іншых спаборніцтваў і з большым прызавым фондам). А ў жанчын, у адрозненне ад мужчын, шлюб і нараджэнне дзяцей, што называецца, "не спрыяюць" далейшай конкурснай кар'еры.

На лёсаванні інтрыга толькі ўзмацнілася: тут адбылося першае знаёмства з удзельнікамі, іх вакальнымі ды артыстычнымі данымі, густам і ўяўленнем пра сябе саміх, бо нумар для "прэзентацыі" нічым не абмяжоўваецца.

У некаторых выступленне ў гэты дзень аказалася самым лепшым. Часткова гэта можна патлумачыць рознасцю сцэнічных пляцовак: маўляў, лёсаванне — у філармоніі, а ўласна конкурс — у Амфітэатры, дзе зусім іншыя маштабы. Але насамрэч справа — у рэпертуары. Менавіта абраныя для выканання творы, а не прыхамаць членаў журы, сталіся прычынай такіх рэзкіх змен у ацэнках некаторых канкурсантаў і надалей, калі розніца паміж першым і другім днямі дасягала ажно 18 балаў.

Прад'явіце ваша "меню"!

Самымі выйгрышнымі на лёсаванні аказваліся фрагменты з мюзіклаў. Заканамерна! Бо яны давалі магчымасць прадэманстраваць не толькі вакальныя, але і акцёрскія, сцэнічныя якасці канкурсанта. Раптам падумалася: а ці ёсць што прад'явіць у гэтым кірунку беларусам? Узгадалася хіба "Белая ластаўка", якая два гады таму прынесла Гран-пры на "Славянскім базары ў Віцебску" Алене Ланской. Але гэты фрагмент з мюзікла Уладзіміра Кандрусевіча "Соф'я Гальшанская" — таксама даволі традыцыйная паводле сваёй кампазіцыі песня. А дзе ж гульнёвыя, добра зрэжысіраваныя менавіта сцэнічныя нумары? Там жа, дзе і самі беларускія мюзіклы: ці ў кампазітарскіх партфелях (што, дарэчы, зусім не паказчык іх якасці), ці, куды часцей, у кампазітарскіх думках, а яшчэ часцей — толькі ў марах…

Да таго ж, калі ў нас і з'яўляецца нешта падобнае, дык кампазітар, уваходзячы ў становішча артыстаў, імкнецца напісаць музыку, як мага больш простую для выканання. А конкурс патрабуе супрацьлеглага. Замежныя творцы не стаяць перад гэтай дылемай, бо на кожную пастаноўку праводзіцца кастынг. І ёсць з каго выбіраць! У нас жа на такія кастынгі прыходзяць хіба пачаткоўцы. Дык, можа, выкарыстаць вопыт кінапроб? Бо на іх выклікаюць не ўсіх, хто сам таго пажадае, а тых, каго выбяруць стваральнікі стужкі. Праўда, у кіно і грошы большыя, і залежнасць ад індывідуальнага акцёрскага графіка — меншая. Але задумацца ёсць пра што, і не толькі ў дачыненні да конкурсу.

Асаблівасці нацыянальнай "кухні"

Калі прытрымлівацца слоўніка "меню", дык песня на лёсаванні — штосьці накшталт халоднай закускі, павіннай узняць апетыт. Асноўная ж конкурсная страва — дзве песні ў Амфітэатры як дзве перамены гарачага. Прычым першая — абавязкова з нацыянальнай кухні, а другая — са славянскай. І тут высветлілася, што ў некаторых краінах ці то кампазітары не ўмеюць пісаць песні, выйгрышныя для выканальніцкага конкурсу (а так да пэўнага часу было і сярод беларускіх творцаў), ці то спевакі не ўмеюць іх адшукваць або замаўляць.

Наш канкурсант Аляксандр Салаўёў даў нагоду ганарыцца беларускай кампазітарскай школай, патрыятычна ўраўнаваўшы яе са славянскай і сусветнай класікай: замест абавязковай адной ён спяваў усе тры песні — беларускія. Сілу Сашынай энергетыкі, яго харызму і абаянне прадэманстравала песня "Без крылаў у неба" Алены Атрашкевіч у час лёсавання. Тонкім лірыкам ён паўстаў, выконваючы "Маму" Валерыя Галаўко — папраўдзе філігранна, пафіласофску глыбока і вельмі цёпла, з новай, зробленай з улікам яго пажаданняў, аранжыроўкай. Без перабольшання, гэтая інтэрпрэтацыя, на мой погляд, аказалася лепшай за ўсе ранейшыя, сярод якіх — Валерыя Дайнэкі, Наталлі Падольскай, гуртоў "Камерата" і "Litesound". Ледзь не ўпершыню мы не проста пачулі, а менавіта асэнсавалі простыя і тым вельмі кранальныя словы Алены Туравай. Песня "дыхала", жыла, свяцілася трапяткім полымем свечкі…

А вось аранжыроўка знакамітай песні Юрыя Семянякі "Ты мне вясною прыснілася" нагадвала тыя, якія робяцца для звычайных канцэртаў на шырокую публіку ў разліку на тое, што зала стане падпяваць. Вакалісту пакінулі толькі паўторы мелодыі, без запавольвання тэмпу ці хаця б прыпынку, дзе можна як след пацягнуць высокую ноту, без аніякіх пройгрышаў, каб спявак мог уставіць свае джазавыя імправізацыі, паказаць майстэрства філіроўкі голасу. Дый аркестр вымушаў саліста фарсіраваць гук, а не імкнуцца да тонкасці адценняў, што так уразіла ў яго выкананні напярэдадні. У выніку песня і сама спеўная манера ўспрымаліся як штосьці надта простае і нават, па словах некаторых членаў журы, "старамоднае", "састарэлае". Таму калі пасля першага конкурснага дня "беларускі салоўка", як называлі Сашу ў Віцебску, заняў самую верхнюю пазіцыю, набраўшы 98 балаў са 100 магчымых, дык у другі скаціўся толькі на шостую: 84 балы, як і ў яшчэ чатырох абсалютна сярэдніх канкурсантаў. А між тым, вакальна ён зрабіў усё, што ад яго залежыла! Немагчыма было не звярнуць увагу, як змянілася нават тэмбральная афарбоўка яго голасу, наблізіўшыся да класічнай "песняроўскай", з якой песня ў свой час атрымала папулярнасць.

Для сябе ці для гасцей?

Адна з нашых якасцей, настолькі трывала выхаваных у савецкія часы, што стала ўжо ледзь не ментальнай, можа быць азначана прыблізна так: усё лепшае — гасцям. Гэта выяўляецца і ў святочным меню нашых сем'яў, калі пры гасцях на стол выстаўляецца тое, што сабе мы дазволіць не можам, і ў фестывальных умовах ("Славянскі базар..." за гады свайго існавання шмат зрабіў, каб нівеляваць гэтыя адрозненні). Пры чым жа тут конкурс?

Выступаючы з аркестрам, многія канкурсанты спявалі значна лепш, чым пад фанаграму. Што, на другі дзень конкурсу яны лепш прыстасаваліся да сцэны Амфітэатра ці з большай адказнасцю паставіліся да новай для некаторых практыкі? Не толькі. Бо кожны дырыжор, які працуе са спевакамі, — яшчэ і дадатковы педагог. І тое, што канкурсанты "Славянскага базару..." штогод выступаюць з Нацыянальным акадэмічным канцэртным аркестрам Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста нашай краіны, прафесара Міхаіла Фінберга, — чарговы таму доказ. Міхаіл Якаўлевіч як ніхто іншы выдатна адчувае прыроду вакалу, магчымасці кожнага са спевакоў, і яго мудрыя парады пад час рэпетыцый, сведкам якіх я неаднойчы станавілася, вельмі дапамагаюць канкурсантам. Вялікую ролю адыгрывае і аркестроўка, што робіцца пад кожнага канкрэтнага выканаўцу. У дачыненні ж да "свайго" (а наш канкурсант Аляксандр Салаўёў ужо тры гады як саліст фінбергаўскага калектыву) спрацаваў, відаць, праславуты "рэшткавы" прынцып. Тым больш, што падбор конкурснага рэпертуару для Сашы рабіўся літаральна ў апошняе імгненне. Значыць, трэба праводзіць конкурсны адбор раней, а не ў красавіку. Пра тое Міхаіл Фінберг ужо які год запар б'е ў набат.

Склад удзельнікаў і іх рэпертуар — асноўныя болевыя кропкі любога конкурсу, у тым ліку і "Славянскага базару ў Віцебску"

Лідзіруе "трэцяя частка"

Узровень конкурсу можа было ацаніць ужо на лёсаванні, прычым не толькі па першых песнях, але і па першых праспяваных фразах. І ён, на жаль, не такі высокі, як, да прыкладу, летась, хаця ўсе казалі адваротнае. Не, вышэйшая планка не апусцілася! Але канкурсанты быццам выступалі па дзвюх катэгорыях — не ўзроставых, а якасных, прафесійных і мастацкіх. Гэта пацвердзілі і ацэнкі журы ў першы і другі дзень. Колькасць атрыманых канкурсантамі балаў мела надта вялікі разрыў паміж групай лідараў — і ўсімі астатнімі. Таму конкурсныя "баталіі" разгортваліся не між усімі ўдзельнікамі (а іх, нагадаем, было 21), а — прыблізна трэцяй іх часткай ад агульнай колькасці. Сярод жа "дзвюх трэціх", што засталіся, сустракаліся тыя, чыя вакальная падрыхтоўка "не дацягвала". А між тым, нават тыя, хто атрымлівае бал "пяць" пры самым нізкім "чатыры", становяцца на "Славянскім базары..." дыпламантамі конкурсу. Зразумела, гэта зусім не спрыяе сёння ўжо вельмі і вельмі высокаму іміджу нашага фэсту. Асабліва ў тых выпадках, калі з якой-небудзь краіны канкурсанты прыязджаюць упершыню. Уявіце сітуацыю: у сябе на радзіме той спявак — так, ніхто. А ад нас вяртаецца — дыпламантам Міжнароднага конкурсу. Варыянтаў можа быць толькі два: дома спевака недааца ньвалі — ці ўзровень нашага спаборніцтва слабы.

Цалкам трымае планку, здаецца, хіба Грузія, штогод дасылаючы сапраўдных профі. А з той жа Украіны, якая дала Віцебску шмат лаўрэатаў і ўладальнікаў Гран-пры, даволі часта едуць далёка не лепшыя прадстаўнікі. З некаторых іншых краін — таксама. Далёка не ва ўсіх краінах праводзяцца папярэднія адборы, як у нас. Канкурсанты павінны мець рэкамендацыю — ад таго ж прадзюсарскага цэнтра ці музычнай студыі. А іх паўсюль — шмат. І, падобна на тое, выбар часам робіцца на карысць не лепшых, а "сваіх", каго з тых ці іншых прычын хочуць прасунуць. Можа, у такіх выпадках камусьці даваць проста дыплом удзельніка, як гэта робіцца паўсюль у свеце?

Але, да гонару журы, сваёй справядлівасцю яно імкнулася ўзняць імідж конкурсу. Заўважу, аднак, што так рабілі не ўсе. Але ж і сапраўды, ніводны моцны выканаўца не быў сёлета "пракінуты". Нават вельмі адораная расіянка Рая Маўсісян, якая знайшла сваё "Я" на стыку славянскага і ўсходняга эстраднага этна, але па незразумелых прычынах набрала за два дні ўсяго 166 балаў, атрымала Спецыяльную прэмію імя У.Мулявіна. Праўда, пры падзеле другой прэміі было парушана Палажэнне аб конкурсе, бо ў Яўгена Андрыянава з Малдовы было 188 балаў, у Арчыла з Грузіі — 184, а розніца можа быць толькі да двух. Затое Трэцюю прэмію пры такім раскладзе давялося дзяліць не на траіх, а на дваіх: Крысці з Румыніі — 183 балы, наш Саша — 182. Першае месца заняла Сабрына з Харватыі. Старшыня журы Ларыса Доліна высока ацаніла яе голас і харызму, дадаўшы, што сёлета прэміі давалі — за патэнцыял, пакідаючы за дужкамі дрэнны стан галасавых звязак. Гран-пры цалкам справядліва атрымаў тонкі, вельмі нацыянальны па стылі, амаль "шапэнаўскі" выканаўца Міхал Качмарэк з Польшчы. А спевы саміх членаў журы пацвердзілі старую ісціну: самымі "строгімі" былі тыя, хто выступаў куды горш за канкурсантаў. Самымі ж спагадлівымі аказаліся не толькі публіка, але і наш член журы Анатоль Ярмоленка, які выставіў за два дні ажно 14 "дзясятак": беларусы, як заўсёды, "хварэлі" не толькі за сваіх…

Надзея БУНЦЭВІЧ,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Віцебск — Мінск
Фота Юрыя ІВАНОВА

Дыпломнікі

Дакументалісты абараніліся: ці спрацуе формула "адзін з пяці"

У будучыні беларускай тэлерэжысуры — жаночае аблічча. Каб упэўніцца ў гэтым, трэба было наведаць адмысловы выпускны экзамен факультэта экранных мастацтваў БДАМ. З васьмі выпускнікоў толькі двое належалі да той паловы чалавецтва, якая яшчэ нядаўна дамінавала ў рэжысёрскай прафесіі. Да таго ж, самыя ўдалыя і прафесійныя дыпломы знялі якраз дзяўчыны. Аднак, прызнаемся, калі не заглядваць у анатацыі ды фінальныя цітры, вызначыць гендарную прыналежнасць аўтараў выпускных стужак было складана. Бо сакрэт поспеху на экране ад яе абсалютна не залежыць.

А залежыць ён выключна ад таленту, стараннасці ды жадання зрабіць свой твор максімальна цікавым не толькі для ўдзельнікаў здымак. І выпускнікі-2013 гэтыя здольнасці, кожны ў сваю сілу, прадэманстравалі, абраўшы максімальна цікавых герояў ды актуальныя тэмы.

Паказальна, што здымаць мастацкую дакументалістыку ад выпускнікоў, збольшага, не патрабавалася, бо выпускаўся курс па спецыяльнасці "Рэжысура тэлебачання", а малы экран мае сваю спецыфіку, якая робіць акцэнт на інфармацыйны, а не на эмацыйны складнік. Тым больш пахвальна, што практычна ўсе выпускнікі курса старшага выкладчыка, тэлерэжысёра Вячаслава Акімушкіна падышлі да сваіх дыпломаў з вялікім творчым імпэтам і пастараліся зрабіць не звычайныя нарысы або тэлепартрэты, а нешта большае. У некаторых выпадках у сёлетніх выпускнікоў факультэта экранных мастацтваў атрымаліся сапраўдныя — глыбокія, высокамастацкія — дакументальныя работы, якія зрабілі б гонар вопытным майстрам і сур'ёзным міжнародным фестывалям.

Так, Дар'я Андрыянава стварыла вострасацыяльны аповед пра жыццё маленькіх беларусаў з абласнога цэнтра. Чорна-белая выява, бездакорна знятая адразу трыма аператарамі — Русланам Фядотавым, Мікалаем Жалудовічам і Арсеніем Хачатуранам, — стварае адпаведны настрой: аднавымернае існаванне герояў "Пад скурай горада" ляжыць у паралельным свеце адносна жыцця сучаснага соцыуму. Можна сказаць, што рэальна існуючыя персанажы фільма Дар'і Андрыянавай кожны дзень ходзяць побач з намі, але... застаюцца па-за ўвагай грамадства. Такім чынам, стужка выпускніцы БДАМ раскрывае вочы на праблемы, якія звычайна стараюцца не заўважаць.

Малады рэжысёр вельмі цікава і прафесійна пабудавала кампазіцыю свайго дыпломнага твора. Галоўны герой фільма — хлопчык перадпубертатнага ўзросту — паступова праяўляецца сярод купкі такіх жа абадраных і падобных да беспрытульнікаў мальцаў, якія, дурэючы, забаўляюцца на задворках вялікага горада. Паступова становіцца зразумела: малы — зусім не беспрытульны, ён мае родных, дах над галавой, ходзіць у школу, дзе няблага вучыцца, бо мае пэўныя задаткі, і наогул, жыве не горш за равеснікаў, сярэднім, можна сказаць, тыповым жыццём. Апошняя выснова ўзрушае больш за ўсё: заганны лад існавання з усімі прыкметамі дэградацыі аказваецца звычайным, паўсядзённым, шырока распаўсюджаным...

Смелы натуралізм у дэманстрацыі грамадскіх хібаў, зайздросная якасць пабудовы кадра, сучасны падыход да паказу герояў — "Пад скурай горада" выглядае як паўнавартасны твор "набіўшага руку" прафесіянала. Гэтак сама, як і "Марына Сяргееўна" Ганны-Марыі Сівіцкай — пятнаццаціхвілінны партрэт рэжысёра сталічнага Палаца культуры чыгуначнікаў. Партрэт у жанры прамога назірання зняты рухомай камерай і без дадатковых тлумачэнняў у выглядзе закадравага тэксту перадае максімум інфармацыі аб гераіні. Малады рэжысёр і аператар здолелі насыціць сваё назіранне такой колькасцю "гаваркіх" дэталей, што ў экранным вобразе Марыны Сяргееўны чытаецца ўвесь ейны лёс і нават праглядвае сацыяльны тыпаж, які дазваляе гледачу выйсці на абагульненне. Нездарма жак астатніх выпускнікоў. Пэўныя тэхнічныя хібы кампенсуюцца вастрынёй абранай тэматыкі і цікавымі персанажамі.

Аляксандра Захарэвіч у сваім "Двайным партрэце на фоне..." узнімае спецыфічнае пытанне стандартаў сучаснай жаночай прыгажосці. Яна ўдала прапануе паралельны партрэт хударлявай дзяўчыны-мадэлі і дзяўчыны "ў целе". Цікава, што, маючы намер распавесці аб праблеме распаўсюджвання захворвання на анарэксію сярод дзяўчат, пачынаючы рэжысёр выйшла на філасофскую выснову кшталту "Шчасце залежыць ад унутранага стану чалавека".

Кадры са стужкі Ганны-Марыі Сівіцкай "Марына Сяргееўна".

Парог кінажыцця

Вострыя пытанні рубам наконт захавання нацыянальнай культурнай спадчыны паставілі Дар'я Мурашка і Вікторыя Альшэўская. Першая ў калектыўным партрэце ўдзельнікаў ды прыхільнікаў Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча паспрабавала асвятліць злабадзённыя праблемы існавання праслаўленага калектыву ва ўмовах сучаснага "шоубізу". Другая стварыла замалёўку сучаснага стану архітэктурных славутасцей нашай краіны.

У жанры класічнага тэлевізійнага партрэта зроблены дыпломы Марыі Калоднік "Булат", Юрыя Слабоцкага "Поўны дом" і выпускніка завочнага аддзялення факультэта экранных мастацтваў (мастацкі кіраўнік — старшы выкладчык Валерыя Скварцова) Міхаіла Бярнацкага "Адваротны бок медаля". Усе работы вылучае зайздроснае ўменне падыйсці да свайго героя на максімальна блізкую адлегласць, "уключыць" яго ў прастору нарыса.

Збольшага, калі рабіць высновы, зыходзячы выключна з дыпломных работ, то самыя вялікія шанцы сказаць па-сапраўднаму гучнае слова ў дакументалістыцы — менавіта ў аўтараў стужак "Марына Сяргееўна" і "Пад скурай горада". Прынамсі, пра тое сведчыць сусветная статыстыка: з пяці выпускнікоў рэжысёрскіх кінашкол у прафесіі застаецца адзін. Зразумела, мы жадаем поспехаў і творчых дасягненняў усім сёлетнім выпускнікам факультэта экранных мастацтваў. Спадзяёмся, на месцах іх размеркавання (а яны даволі розныя: ад тэлеканалаў да відэастудый грамадскіх арганізацый і цэнтраў дзіцячай творчасці, куды, да прыкладу, размеркавалі Дар'ю Андрыянаву) таленты маладых рэжысёраў знойдуць урадлівую глебу і прадоўжаць рост. Пажадаем знайсці сваё месца і Ганне-Марыі Сівіцкай, якая карысталася платнай формай навучання. Творчае жыццё за межамі Акадэміі толькі пачынаецца…

Антон СІДАРЭНКА

Тэатральная плошча

Тры сакрэты дзіцячага спектакля

Нават на сталічных сцэнах дзіцячы рэпертуар звычайна выклікае больш за ўсё пытанняў — на жаль, часцей без адказаў. Таму вестка, што "Казка пра чырвоную стужачку" паводле "Мяцёлкавай казкі" расійскага драматурга Галіны Латышавай пастаўлена ў Мінскім абласным драматычным тэатры адным з яе вядучых артыстаў Алегам Чэчаневым, асаблівага ажыятажу ў мяне не выклікала. І — дарма, як высветлілася пазней: некаторыя яе ідэі маглі б быць карыснымі для іншых.

Сакрэт першы — "прымерка з перакроем". Да рэдагавання п'ес звяртаюцца сёння ці не ўсе рэжысёры. Знайшоўшы матэрыял у Інтэрнэце і атрымаўшы ад яго аўтара дазвол на пастаноўку, Алег Чэчанеў шмат чаго перарабіў у сюжэце, які ўяўляе з сябе сумесь казкі В.Шукшына "Да трэціх пеўняў" з "Чараўніком Смарагдавага горада" А.Волкава (ці, у арыгінале, "Чараўніком з Краіны Оз" Л.Баўма). Івана выганяюць з маёнтка, дзе ён працаваў, пакуль не паразумнее. За розумам яго адпраўляюць да Чорта Лысага. Па дарозе да яго далучаецца Хатка Бабы-ягі, што вырашае прасіць смеласці, і сама Бабуля, якой не церпіцца памаладзець. Вядома, героі здабываюць сваё шчасце, Іван бярэ шлюб з Прыгажосцю Ненагляднай, і гэта становіцца залогам яго дабрабыту на ўсё жыццё.

Як зрабіць казку

Адна маленечкая дэталь: хлопца, які павінен быць Хаткай, рэжысёр замяняе на дзяўчыну. І да азначаных сюжэтных ліній далучаецца тая, што разлічана на падлеткаў: дзяўчынка-сябра, "свой хлопец", якая выратоўвае героя (хатка тут становіцца сімвалам абароненасці і ўтульнасці) — і больш дарослая таямнічая незнаёмка, якую выратоўвае ён сам.

Яшчэ адна дэталь — рэжысёр замяняе Чорта на Карча Лысага. І п'еса адразу набывае рысы пантэізму, у ёй узнікаюць ніці, што вядуць да язычніцкіх часоў, калі з усімі просьбамі людзі звярталіся да з'яў прыроды, тых жа дрэў ды старых карчоў. Сцэнічныя строі Сяргея Антонава пераконваюць: у фінале беларус ажаніўся з рускай — і п'еса становіцца нам яшчэ бліжэйшай. Адмоўных персанажаў не забіваюць, а ператвараюць у дрэвы — чым не беларуская талерантнасць? А вось балота, у якім ледзь не гінуць вандроўнікі, са спектакля знікае...

Спектакль становіцца беларускім па сутнасці, хаця ідзе на рускай мове. Апошняе — умова "заказчыкаў". Беларускім пастаноўкам, прызначаным для летняга пракату па дзіцячых аздараўленчых летніках, у апошніх зусім не рады. Па-першае, акрамя нашых, у такіх установах адпачываюць дзеці таксама і з Расіі. Па-другое,

Мастыхін

Мудрасць сакральнасці

Гродзенскі мастак некалькі дзесяцігоддзяў піша касцёлы

Творчыя прыярытэты гродзенскага мастака Станіслава Кічко, які 21 ліпеня адзначае сваё 70-годдзе, на працягу дзесяцігоддзяў звязаны з сакральнай тэматыкай. Як шчыры хрысціянін ён у сваіх работах увасабляе найперш каталіцкія храмы Гродзеншчыны. Аўтар дасканала ведае іх гісторыю і ў першую чаргу звяртае ўвагу на помнікі, звязаныя з лёсамі вядомых людзей ці з падзеямі асабістага жыцця.

Так, скляпенні касцёлаў у Лудне, Камянцы, Гродне памятаюць знакамітую Элізу Ажэшка. Сцены храма ў Старых Васілішках могуць распавесці пра дзяцінства спевака з сусветнай славай — Чэслава Нэмэна, бацька якога служыў у гэтым касцёле арганістам, а маленькі Станіслаў Кічко пайшоў тут да першай камуніі.

Найбольш шырока тэма касцёла была прадстаўлена на выстаўцы ў галерэі "Ag-art" у Беластоку (2010 г.). Аўтар не проста ўзнаўляе архітэктуру імклівай готыкі ці пышнага барока, а стварае выразны мастацкі вобраз, напоўнены моцнай экспрэсіяй. Выявы касцёлаў як бы лунаюць у прасторы, і там, у нябесных сферах, духоўна аб'ядноўваюцца з постацямі, што былі ў зямным існаванні злучаны з гэтымі храмамі ці з рэлігіяй увогуле. Шмат хто з гэтых людзей прыняў пры жыцці пакуты.

Шэраг работ прысвечаны святару, які некаторы час служыў у Францішканскім касцёле Гродна і загінуў у Асвенцыме ў 1941 г., кананізаванаму святому Максімільяну Кольбэ. Адзін з гэтых твораў быў уручаны Папу Рымскаму Яну Паўлу II пад час аўдыенцыі дэлегацыі горада Гродна ў Ватыкане ў 1987-м. У іншай рабоце паказаны ксёндз з мястэчка Ішчална Шчучынскага павета Адам Фалькоўскі, які абвяшчаў у сваім храме маніфест паўстанцаў у 1863 г., а пасля быў схоплены і расстраляны пад Лідай. Асоба Яна Паўла II, фігура якога дамінуе над наваколлем, вылучаецца пачуццём годнасці, мудрасці, спакою.

Дзякуючы арыгінальнасці вобразнага ладу твораў, рэальныя постаці на палотнах узвышаюцца да агульначалавечых ідэалаў ахвярнасці, святасці, адданасці высокім памкненням. Размяшчаючы ў адзінай прасторы дакладныя выявы архітэктурных помнікаў, вобразы людзей, аўтар арганічна аб'ядноўвае іх з умоўна-абстрактным фонам, што сімвалізуе свет вышэйшы, як бы спалучаючы там шлях чалавека зямны і нябесны. Выяўленню светапогляднай канцэпцыі мастака дапамагае адмысловая аўтарская тэхніка выканання з выкарыстаннем матэрыялаў ды прыёмаў і алейнага жывапісу, і графікі. У стылёва вельмі пазнавальных кампазіцыях глыбокі змест чытаецца праз структурна складаную, але імпрэсійна лёгкую, вытанчаную форму.

Гармоніяй прыгажосці знешняй і дасканаласці ўнутранай вылучаецца вобраз Божай Маці, выявы якой мастак піша на працягу жыцця, кожны раз адлюстроўваючы ейныя своеасаблівыя адметныя рысы. Работы дадзенай серыі адрозніваюцца асаблівай мяккасцю пластычна-колеравага рашэння, філасофскай паглыбленасцю. Яны былі прадстаўлены на персанальнай выстаўцы творцы "Промнямі мацярынства асветленая" ў гродзенскай галерэі "Крыга" летась. Станіслаў Кічко, эстэтычна апелюючы да ўстойлівых іканаграфічных традыцый, па-мастацку пераасэнсоўвае старажытныя каноны. Асацыіруючы вобраз Божай Маці найперш з ідэалам мацярынства ўвогуле, аўтар пранікнёна сцвярджае яго нязменную маральную каштоўнасць ("Матчына ласка", "Мацярынства"), падкрэслівае пакорнасць Маці і трагічную прадвызначанасць лёсу Сына ("Непакаляная", "Маці Збавіцеля"). Асаблівую ўвагу мастак надае іконе "Божая Маці Вострабрамская", якая захоўваецца ў Вільні і якой пакланяюцца і каталікі, і праваслаўныя. Уводзячы гэтую выяву ва ўмоўна-абагуленыя кампазіцыі, аўтар успрымае вобраз як сімвал усеагульнай заступніцы, апякункі роду чалавечага. У народнай стылістыцы вырашаны творы, прысвечаныя мясцовым зводам Божай Маці, напрыклад, Тракельскай, Чанстахоўскай.



Прыярытэты Станіслава Кічко як бы прадвызначылі яго працу ў сааўтарстве па стварэнні мастацкіх канцэпцый экспазіцый гродзенскага Музея гісторыі рэлігіі, Дома-музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку. У планах — праекты філасофскага кірунку, таксама традыцыйна звязаныя з гісторыяй хрысціянства.

Марына ЗАГІДУЛІНА,
мастацтвазнаўца
Гродна

Раскадроўка

"Беларускі відэацэнтр" завяршае працу над фільмам "Рана ў сэрцы. Міхал Клеафас Агінскі".
На здымку: кадр з будучай стужкі.

Вернісаж

У сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва працуе выстаўка нашага земляка — вядомага жывапісца з Малдовы Вячаслава Ігнаценкі. Назва персанальнай экспазіцыі творцы — "Калейдаскоп".

падарункавай?

нашы часта ведаюць беларускую мову не лепш за расіян. А лагеры ідуць па шляху найменшага супраціўлення: маўляў, мы што, дзецям яшчэ тлумачыць павінны, калі яны раптам тэкст не зразумеюць? Праўда, у некаторых установах, дзе іграюць артысты, немагчыма зразумець (дакладней, пачуць з-за акустычных умоў) увогуле ніякага тэксту…

Таму сакрэт другі — паболей музыкі, танцаў, пластыкі, выразных "гаваркіх" касцюмаў і рухаў, каб сюжэт успрымаўся не столькі праз словы (а нішто не стамляе дзяцей больш за марудныя "лекцыі"), колькі — візуальна. Запрасіўшы да супрацоўніцтва Уладзіміра Сівіцкага, вядомага па музыцы да фільмаў "Чаклун і Румба", "Снайпер. Зброя помсты" ды іншых, а таксама пакуль нікому не вядомую Віталіну Бідзюк, каб тая ператварыла песні ў танцы, рэжысёр адразу зняў з сябе шмат непасільных задач па ўтрыманні дзіцячай увагі. Асабліва адзначу харэаграфічны бок, дзе ўдала змяшаліся элементы розных стыляў — ад фольку да хіп-хопа, — героі набылі адметнасць, абвастрыліся іх характары і памкненні. Сярод сцэнічных строяў вылучу Хатку: на "піжаму" ў клетку апранаецца "камізэлька" — у выглядзе хаткі. І калі артыстка прысядае, увагнуўшы галаву, падабенства папраўдзе казачнае. Гэты прыём — рух упрысядкі — можна было б выкарыстоўваць з самага пачатку дзеі, а не толькі ў канцы. Тым больш, што Ала Цырук і не на такое здольная: па ходзе спектакля яна і на шпагат садзіцца, і фуэтэ круціць!

Сакрэт трэці — спектакль падабаецца самім артыстам. Таму яны робяць усё "як сабе", а не "як людзям": выкладваюцца напоўніцу, іграюць з апантанасцю ды бляскам у вачах, нібыта атрымалі ролі не менш як Джульеты, Гамлета ды іншых "сур'ёзных" персанажаў. Казка выйграе за кошт выбару акцёраў, удала пастаўленай тузаніны, калі верыш, што артысты калашмацяць адно аднаго па-сапраўднаму. А яшчэ — за кошт іх імправізацыі ў інтэрактыве. Пад апошнім маюцца на ўвазе не звыклыя запыты "ў публіку" (накшталт: верыць злодзею-ашуканцу ці не?), а звароты ў залу: "Хто хоча венічак?" (і адразу — лес рук: "Я! Я!"), — іншыя "прыколы", што нараджаюцца ў артыстаў часцяком спантанна і ўлічваюць асаблівасці аўдыторыі.

Спачатку спектакль быў пастаўлены на стацыянарнай сцэне, там жа прайшлі прэм'ерныя паказы. У самім тэатры дэкарацыі — крыху іншыя. Ёсць па баках і акенцы, праз якія на пачатку спектакля бабы лямантуюць, лаючыся на Івана. "Складны-выязны" варыянт сцэнаграфіі з'явіўся пазней — на этапе, калі стала зразумела, што спектакль не толькі ўклаўся ў каштарыс, але яшчэ і нешта засталося. На фоне даволі простага сцэнічнага афармлення, за якім "не схаваешся", ярчэй відаць адданасць выканаўцаў, агульную дынамічнасць спектакля, што глядзіцца "на адным дыханні". І ў выніку дае фору многім сталічным дзіцячым пастаноўкам — куды больш багатым па "інтэр'еры", але танным па эстэтыцы ды пустым па энергетыцы.

Але ж вось парадокс: чым лепш пастаўлена казка, тым больш пытанняў узнікае да драматургічнага матэрыялу. Як прызнаўся Алег Чэчанеў, п'еса "зачапіла" яго ўжо тым, што ёсць хоць якія нязбітыя персанажы. Але няўжо ў нашых літаратараў фантазія знікла? Мо проста забыліся, як самі былі дзецьмі і кожная шчылінка на сцяне выглядала таямнічымі абрысамі прывідаў, а кожная побытавая рэч — героем выкшталцоных прыгод? Сусветная практыка сведчыць: калі пісьменнікі "прыкоўваюць" сябе да стала, дык казкі і пішуцца — "у стол".

Дык як у нас з дэмаграфіяй сярод драматургаў? Калі дрэнна, дык, можа, адправіць іх "у творчую камандзіроўку" па дзіцячых садках ды летніках — хаця б на тыдзень, для пошуку новых тэм?..

Надзея БУНЦЭВІЧ,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Маладзечна — Мінск
Фота Сяргея ЛЕСКЕЦЯ

Нашы землякі ў Літве: ключавыя звёны і сіндром аднаго пакалення

“Флікеры” нашай прысутнасці

Беларусы, якія апынуліся па той бок дзяржаўнай мяжы з Літвой, не забываюцца на родныя звычаі, шчыра настальгіруюць па радзіме і ніколі на яе не наракаюць, бо прызвычаіліся разлічваць пераважна на ўласныя сілы. Тым не менш, “вялікая зямля” цалкам можа вырашыць некаторыя іх праблемы, — да такой высновы прыйшлі карэспандэнты “К” пад час свайго кароткага экскурсу ў святочнае і будзённае жыццё нашых суайчыннікаў па той бок літоўскай мяжы, якіх, паводле статыстычных звестак, сёння каля 50 тысяч.

Адлегласці ўводзяць у зман

Уваход у Беларускі культурны цэнтр Шальчынінкая знайсці даволі проста: убачыце помнік Каліноўскаму — і адразу направа. Работа скульптара Валяр’яна Янушкевіча была ўстаноўлена менавіта намаганнямі БКЦ: каб нагадаць усім мінакам пра існаванне ў гэтым краі беларускай супольнасці. Не раўнуючы, бы той флікер, які дазваляе “зрабіцца прыкметным”.

Супольнасць тая, дарэчы, зусім невялікая. У Шальчынінкайскім раёне нашых суайчыннікаў недзе каля тысячы, з іх прыблізна паўтары сотні прымаюць хоць які ўдзел у жыцці зямляцтва. І тэндэнцыі зусім не радуюць...

Кіраўнік БКЦ Мікалай Амялевіч — родам са Шчучыншчыны. Нягледзячы на тое, што ў памежных раёнах мы чакалі сустрэць перадусім менавіта беларусаў-“аўтахтонаў”, адразу выявілася прыкметная тэндэнцыя: тыя, хто ўпарта “трымаюцца свайго” — гэта пераважна людзі, якія нарадзіліся ў сённяшніх межах Беларусі ды ўжо ў сталым веку прыехалі ў Літву.

— На свет я з’явіўся ў Камянцы, жыў у Расіі, а беларускую мову вывучыў у Літве, — знаёміць з эпізодамі ўласнай біяграфіі Алег Давідзюк, кіраўнік Беларускага культурнага цэнтра “Крок” з Вісагінаса.

Гэты “штучны горад”, створаны ў 1975 годзе спецыяльна для абслугоўвання Ігналінскай АЭС, быў заселены прадстаўнікамі дзясяткаў народаў з усяго СССР. Беларусаў туды панаехала нямала, балазе да нашай мяжы адтуль — усяго які кіламетр. Але калі мяжа стала дзяржаўнай, выявілася, што адлегласці ў дадзеным выпадку — рэч падманлівая.

— Вежы Відзаўскага касцёла ледзь не з майго дома відаць, але каб пагасцяваць у тамтэйшых сваякоў, нам з жонкай трэба ехаць больш за 130 кіламетраў, бо бліжэйшы прапускны пункт апынуўся надта далёка, — распавядае кіраўнік ансамбля народнай песні “Світанак” Сяргей Шабадалаў.

У 1988 годзе яго сям’я перабралася ў Вісагінас у пошуках “лепшай долі”. Далёка не ўсе мары спраўдзіліся, але... У выніку беларуская супольнасць атрымала сапраўдны творчы “рухавік” у асобе Сяргея ды яго жонкі Вольгі.

Адлегласці паміж згаданымі двума цэнтрамі беларускай культуры таксама немалыя: паўтары сотні кіламетраў. Землякі штогод сустракаюцца на “нейтральнай тэрыторыі” — пад час святкавання Купалля, якое стала адной з самых знакавых культурных падзей нашай дыяспары ў Літве. Прычым доўжыцца гэтая традыцыя настолькі даўно, што нават спадарыня Ніна Сусвіло са Швянчонаса, якая стаяла ля яе вытокаў, доўга прыгадвае, калі ж усё пачалося.

Сёлета свята атрымалася, як і раней, душэўнае ды шчырае, пазбаўленае таго не заўсёды дарэчнага пафасу, які часцяком становіцца “лыжкай дзёгцю” на нашых імпрэзах і фэстах народнай культуры. Сяргей Шабадалаў зарэкамендаваў сябе як прыроджаны канферансье: падзел на выступоўцаў і публіку часта нівеляваўся. Але нас перадусім цікавілі не святы, а менавіта будні дыяспары.

Менеджар са схільнасцю да альпінізму

Беларускі цэнтр у Шальчынінкаі месціца пад дахам тамтэйшага “агменю культуры”. Памяшканне невялікае: адзін пакой “шматфункцыянальнага прызначэння” (і творчага, і адміністратыўнага) ды яшчэ пара катушкоў. Зрэшты, на цясноце тут ніхто не скардзіцца — хутчэй, наадварот. Прычына простая: хаця Цэнтр з ласкі гаспадароў будынка не плаціць за арэнду, камуналка ўзімку набягае такае, што хочацца за галаву схапіцца…



Крыніца грашовых паступленняў Цэнтра, па сутнасці, толькі адна — камісійныя за дапамогу ў атрыманні беларускіх віз. На выплату паўнавартасных заробкаў супрацоўнікам гэтых сродкаў не хапае, і таму ўсе працуюць, лічы, на грамадскіх пачатках. Таму і інтэр’ер даволі сціплы, без аніякіх намёкаў на еўрарамонт.

Адзін з катушкоў прыстасаваны пад бібліятэку, што налічвае пад тысячу тамоў. Паўглядаліся на паліцы — карашкі там знаёмыя з нашых школьных часоў. А вось з новымі паступленнямі — зусім бяда. Тое ж самае датычыцца і перыёдыкі: свежы выпуск беларускай газеты па той бок мяжы — вялікая рэдкасць…

— Згаданая вамі праблема — сапраўды навідавоку, — кажа галоўны спецыяліст Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Людміла Лебедзь. — І мы ўжо што толькі ні рабілі, каб яе вырашыць, нават з ансамблямі перадавалі землякам кніжныя “пасылкі”. Ды, вядома, усё гэта пакуль не мае належнай сістэмнай асновы. Асабліва калі казаць пра перыядычны друк…

Не даходзяць беларускія газеты і да Вісагінаса — хоць ты галубіную пошту наладзь з гатычных веж Відзаўскага касцёла! Што ж да памяшканняў, то там гэтая праблема вырашылася вельмі спецыфічным спосабам. Рэпетыцыі ансамбляў ладзяцца ў мясцовым Цэнтры культуры, а вось сам офіс “Кроку” — на ўласных плошчах кіраўніка, які не пашкадаваў для добрай справы ажно 200 “квадратаў”.

— Кожны ўкладае патрошку: штосьці Літва дае, штосьці — Беларусь, штосьці — самі, і такім вось чынам існуём, — распавядае Алег Давідзюк. — Круцімся, адным словам, і прэтэнзій ні да каго не маем! А тым, хто ўвесь час ходзіць з працягнутай рукой, я хачу вось што сказаць: трэба спярша самім нешта даць, а потым ужо прасіць…

Выправа на Купалле ладна спустошыла бюджэт арганізацыі: арэнда аўтобуса пацягнула нямала. А наперадзе ж — наступныя гастролі, у тым ліку і ў Маларыту. Увогуле, канцэртамі на гістарычнай радзіме беларускія ансамблі Літвы зусім не абдзелены: прымаюць іх тут заўсёды гасцінна.

Заўважылі адну цікавую тэндэнцыю: кіраўнікамі беларускіх культурных арганізацый у Літве сталі не прафесійныя работнікі культуры, але тыя людзі, якія няблага рэалізавалі сябе ў іншых сферах ды маюць адпрыродныя менеджарскія здольнасці і пачуццё адказнасці. Прыкладам, Мікалай Амялевіч узначальваў раённую службу ЖКГ.

Алег Давідзюк на момант абрання быў начальнікам участка Ігналінскай АЭС. Яно і не дзіва: гэтую пасаду сінекурай ніяк не назавеш. Прывілей нягуста, а клопатаў — поўны кош. Зрэшты, яму як бываламу альпіністу, што здолеў скарыць не адну вяршыню, да цяжкасцей не прывыкаць. Алег Давідзюк пастаянна ставіць перад арганізацыяй новыя мэты. Прыкладам, не так даўно яна стала ключавым звяном Ассацыяцыі беларускіх суполак памежжа.

— Натуральна, у тых, хто жыве на самай мяжы з Беларуссю, праблемы трохі іншыя, чым, скажам, у нашых суайчыннікаў з Канады, — кажа ён. — І таму ў нас шмат агульных тэм для абмеркавання…

Рэпертуарны голад

На купальскім свяце рэй вёў “Світанак” з Вісагінаса. Калектыў, у складзе якога — каля дваццаці чалавек, ствараe ўражанне шумнай ды вясёлай сям’і, здольнай і “мех парваць”, і “бульбы з воз накапаць”. Традыцыйна сталі гастрольныя падарожжы па розных краінах — уключна, вядома, і з Беларуссю, — што ўжо само па сабе сведчыць пра неблагі менджмент.

Не так даўно свой беларускі ансамбль з’явіўся і ў Шальчынінкаі. “Раніца” існуе ўсяго два гады, але ўжо мае сякую-такую вядомасць у краі, бо не абмяжоўваецца “вузкім колам суайчыннікаў”: актыўна гастралюе па вёсках, бярэ ўдзел і ў вялікіх раённых імпрэзах, тым самым паспяхова робячы ўсё тую ж паважную справу — сведчанне пра беларускую прысутнасць у гэтых мясцінах. Ды паспяхова спраўляецца, нават нягледзячы на тое, што ў яго складзе няма ніводнага работніка культуры: адкуль ім тут узяцца?

— Гэта мне неяк кіраўнік раённага самакіравання ўпікнуў: чаму ж, маўляў, у нас беларускага ансамбля няма? — распавядае Мікалай Амялевіч. — Я адказаў: зраблю! І — зрабіў. Сам заспяваў ды іншых сюды зацягнуў. Прымаем усіх, хто толькі можа спяваць, у тым ліку тых, хто называе сябе палякамі. І такія людзі да нас цягнуцца…

З канцэртнымі строямі праблема вырашылася досыць хутка: некалькі прэзентаваў Воранаўскі раён, астатнія прыбылі з Мінска. Па словах Людмілы Лебедзь, штогод Міністэрства культуры краіны выпраўляе за мяжу не менш за паўсотні камплектаў.

Быць беларусам і ніколі ў жыцці не пабываць на Беларусі... З такой сітуацыяй знаёмы многія нашы суайчыннікі, што нарадзіліся ў аддаленых рэгіёнах Расіі. Пры гэтым яны захоўваюць родную мову, народныя традыцыі і нацыянальную ідэнтычнасць. Адна з такіх людзей — Людміла УРВАНЦАВА. Яна ўпершыню прыехала на зямлю продкаў з расійскага Кургана, узяўшы з сабой дачку і ўнука. Карэспандэнт "К" не абмінуў магчымасці сустрэцца з госцяй, якая, да ўсяго іншага, узначальвае Нацыянальны культурны цэнтр беларусаў Заўралля "Бацькаўшчына", і задаць колькі пытанняў.

Як займець ансамбль-пабрацім?

Ансамбль "Журавачка".

— Як вашы родныя трапілі ў расійскую глыбінку?

— З-за голаду ў 1939-м у Іркуцкую вобласць з Беларусі ехалі цэлымі вёскамі. Сярод іх была і мая родная — Баранкавічы. Маёй маці тады было ўсяго 12 гадоў. А ў 1943-м бабуля ўзяла да сябе яшчэ пяцёра беларускіх дзетак з дзіцячых дамоў, эвакуіраваных пад час Вялікай Айчыннай....

— Ці цяжка было цягам дзесяцігоддзяў родным і знаёмым захоўваць беларускі дух?

— Нам дапамагло тое, што вёска была цалкам беларуская. Усе размаўлялі на роднай мове, спявалі народныя песні, прытрымліваліся сваіх абрадаў. А калі я пераехала ў Курганскую вобласць, то, як аказалася, і там знайшліся беларускія паселішчы. Беларусаў у нас вельмі шмат, хоць па афіцыйным перапісе 2010 года — толькі трохі больш за чатыры тысячы чалавек. Калі ж мы праводзілі сваё анкетаванне, то высветлілася, што як мінімум каля дзесяці тысяч мясцовых жыхароў сябе лічаць беларусамі.

Але людзей трэба было неяк аб'яднаць. Доўгі час у Кургане не было беларускай арганізацыі. Такім чынам, дзесяць гадоў таму давялося пачынаць працу літаральна з нуля, наладжваць кантакты з усімі мясцовымі суайчыннікамі. Першым крокам было стварэнне музычнага калектыву. Нам важна было, каб людзі зацікавіліся роднай мовай, культурай, захацелі адчуць сябе беларусамі. Вялікім штуршком у час нашага станаўлення стаў прыезд у Курган "Песняроў". Поспех быў фенаменальны! Музыканты замест трох далі восем канцэртаў. Пасля гэтага дзейнасць нашай арганізацыі пайшла як па масле…

— Ці вялікі актыў у "Бацькаўшчыны"?

— Ядро Цэнтра беларусаў Заўралля складае каля 25 чалавек. Акрамя таго, у нас дзейнічае сетка абласных, раённых і нават пасялковых суполак беларусаў. Адзначу цікавы факт: у Курганскай вобласці — 23 раённыя бібліятэкі. І ў кожнай з іх маецца беларускі куток, дзе праходзяць разнастайныя мерапрыемствы. У глыбінцы, наадварот, яшчэ больш шануюць свае карані. Больш за тое: пасля наведання Мінска склалася такое адчуванне, што, прызнацца, у нас больш клапоцяцца пра беларускую мову, чым у самой Беларусі.

— Якія ж крокі ў Курганскай вобласці робяцца вамі для захавання беларускай ідэнтычнасці?

— Трэба найперш адзначыць нашы музычныя калектывы. Гэта ансамбль "Журавачка", які складаецца з пятнаццаці чалавек, і дзіцячы спеўны гурт "Харошкі". Акрамя таго, дамаўляемся з іншымі этнічнымі калектывамі адносна, скажам, выканання беларускіх народных танцаў. Ансамбль рускай народнай песні "Душагрэечка" прафесійна выконвае цыкл народных песень, прадстаўляе іх нават на замежнай сцэне. Маецца і Маладзёжны фальклорна-этнаграфічны ансамбль "Русіны", да дзейнасці якога далучаюцца нават этнічныя рускія, якім цікавая беларуская культура. З апошніх мерапрыемстваў магу згадаць вялікі канцэрт, майстар клас выканання песень і вершаў на беларускай мове на базе гарадскога цэнтра "Эліта".

— Як папаўняецца рэпертуар вашых калектываў?

— Папоўніць рэпертуар — праблема. Актыўна супрацоўнічаем з беларускімі суполкамі, абменьваемся фальклорным матэрыялам. Такія сустрэчы двойчы ў год адбываюцца ў Маскве дзякуючы Нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Беларусы Расіі", якая аб'ядноўвае ўсе беларускія суполкі, а таксама Пасольству Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі.

Пад патранатам епіскапа Курганскага Канстанціна, які таксама родам з Беларусі, у нас ладзяцца Калядныя сустрэчы. "Гуканне вясны" штогод адбываецца ў ліцэі для адораных дзяцей, у Кітоўскім раёне святкуем Масленку, пастаянна 24 мая ездзім у паломніцтва ў Далматаўскі манастыр. Сёлета там мы заклалі памятны сквер, пасадзілі алею…

— Не магу не запытацца: хто дапамагае вашай арганізацыі?

— Што да фінансавання, дык яно ідзе пераважна за кошт грантаў. Часткова дапамагаюць спонсары — тыя ж беларусы, якія займаюцца ў Кургане бізнесам. Расійскі фонд культуры дазволіў карыстацца памяшканнем у Кургане, на базе якога мы зрабілі музей "Беларуская хатка". Не забывае пра нас і Беларусь. Мы ўдзячныя, наперш, за нацыянальныя строі. На жаль, на ўсіх удзельнікаў ансамбля, асабліва дзяцей, касцюмаў не хапае. Адчуваем дапамогу і з боку Цэнтра нацыянальных культур Міністэрства культуры Беларусі, асабліва яго дырэктара Міхаіла Рыбакова, які стараецца забяспечыць нас метадычнай, мастацкай літаратурай. Але, безумоўна, штосьці стараемся купляць і за свае грошы. Так, у Мінску знайшла футболкі з дзяржаўнай сімволікай, праўда, толькі аднаго, 58 памеру…

— Чым багатая "Беларуская хатка"?

— Наш музей ствараўся толькі дзякуючы матэрыялам, прынесеным нашымі суайчыннікамі. З адметных экспанатаў — палатно, зробленае з фашысцкіх парашутаў. Даводзілася неаднаразова ездзіць у экспедыцыі, у тым ліку і летась. Збіралі як песенны матэрыял, так і этнаграфічны. Па выніках напісала кнігу. Пакуль маецца толькі электронны яе варыянт. Матэрыялу шмат, таму трэба папаўняць том. На базе сабраных звестак сёлета будзем аднаўляць абрад Зажынак. Да гэтага ў нас было вельмі мала інфармацыі пра яго. Толькі адна з апытаных намі жанчын, якая да вайны жыла ў Беларусі, распавяла некаторыя падрабязнасці абраду на Магілёўшчыне. Цяпер для нас вялікі клопат — знайсці інфармацыю пра народныя ролевыя гульні і забавы. Акрамя таго, было б цікава знайсці ў Беларусі ансамбль-пабрацім, з якім можна было б абменьвацца вопытам, інфармацыяй і нават канцэртамі…

Кастусь АНТАНОВІЧ

> "Беларусаў за Уралам шмат, хоць па афіцыйным перапісе 2010-га — толькі трохі больш за чатыры тысячы. Калі ж мы праводзілі анкетаванне, то высветлілася, што як мінімум каля дзесяці тысяч мясцовых сябе лічаць беларусамі".

— Але ўсё адно нам двух строяў вельмі не хапае, — падзяліўся клопатам Мікалай Амялевіч. — Людзей я ўжо быў нагледзеў, а вось "абмундзіраваць" іх няма ў што…

Ёсць і іншая праблема: рэпертуар. Калектыў назапашвае яго самастойна, вышукваючы ды развучваючы песні сабе па душы. Ніякіх метадычных дапаможнікаў ён ніколі не атрымліваў. "Світанак" з Вісагінаса таксама разлічвае ў гэтай справе на ўласныя сілы.

— Купляю розныя дыскі, знаходжу запісы, звяртаюся да знаёмых паэтаў, кампазітараў, артыстаў, — дзеліцца Сяргей "кухняй" песенных збораў, — аднак для мяне важна не проста адшукаць песню, а знайсці тую, якая раскрывае характар — адметнасць нашага ансамбля…

І тут самі сабой напрошваюцца паралелі з тымі аматарскімі калектывамі, што існуюць "на вялікай зямлі". Натуральна, яны зусім не раскашуюць, але... умовы — усё адно непараўнальныя. Наданне звання "народны" або "ўзорны" гарантуе ансамблю стаўку мастацкага кіраўніка (а тое і некалькі), ды і штат той установы культуры, дзе ён "кватаруе", ахвотна забяспечыць творчую падтрымку. Дапамогуць і ў плане падбору рэпертуару — гэта прамы абавязак метадычных цэнтраў, якія існуюць у кожным раёне.

Натуральна, ніякага мастацкага кіраўніка з профільнай адукацыяй "Раніца" не мае. А хацелася б! Па словах Людмілы Лебедзь, юрыдычна гэтая праблема пакуль невырашальная: уводзіць стаўкі ў замежных грамадскіх арганізацыях ніводзін дзяржаўны орган не мае права.

Заслаць "эмісараў" з дыпломамі БДУКіМ у кожны замежны калектыў таксама наўрад ці атрымаецца. Куды больш прадуктыўным уяўляецца іншы спосаб павышэння мастацкага ўзроўню: правядзенне "бліц-курсаў" для лідараў такіх ансамбляў на Беларусі. Па словах Людмілы Лебедзь, такая традыцыя летась ужо распачалася — на базе Інстытута культуры Беларусі. На жаль, колькасць удзельнікаў семінара была абмежавана: усяго чатырнаццаць чалавек. Але падобныя мерапрыемствы плануецца ладзіць, прынамсі, раз на год.

Ёсць чым пахваліцца і ў плане метадчнага забеспячэння. Беларускі цэнтр нацыянальных культур тыражуе DVD-зборнікі з самым разнастайным матэрыялам: запісамі народных і сучасных песень, аўдыякнігамі, нотамі (са здзівам знайшлі ў падборцы ажно дзве версіі "Вечарынкі ў калгасе"(няўжо яшчэ запатрабавана?). Ды толькі вось, на жаль, тых дыскаў усім ахвотным не хапіла...

— Што да папаўнення рэпертуару ансамбля "Раніца" з Шальчынінкая, — прадоўжыла тэму Людміла Лебедзь, — то хацелася б параіць яго ўдзельнікам звярнуцца ў метадычны цэнтр суседняга Воранаўскага раёна...

Іншая праблема — арганізацыя сустрэч. Мікалай Амялевіч даўно ўжо выношвае планы зладзіць у БКЦ лекторый, прысвечаны гісторыі і сучаснасці Беларусі. Але пакуль што цікавых гасцей з нашай краіны спадарожны вецер заносіць у гэтыя сцены рэдка. Тое ж самае датычыцца і Вісагінаса, хаця зрэдчас прыязджаючы туды на гастролі, прафесійныя беларускія калектывы збіраюць залу.

Сіндром аднаго пакалення

Як гарэзліва прызнаюцца "дзяўчаты" з Вісагінаса, ім усім прыблізна двойчы па 25. Але душэўная маладосць ды зухаватасць не можа схаваць відавочнага: маладых твараў у беларускіх калектывах амаль не ўбачыш, і зусім не таму, што няма вакантных месцаў. Перадаць нацыянальны дух наступным пакаленням у гэты глабалізаваны век — справа няпростая. Тым больш, дзеці нашых суайчыннікаў нярэдка працаўладкоўваюцца ў Заходняй Еўропе, як і многія іншыя грамадзяне Літвы.

— Мой сын ужо ў Лондане жыве, — распавядае Сяргей Шабадалаў. — Кажа, што яму цяжка вызначыцца, хто ён па нацыянальнасці…

Ды і пры ўтварэнні змяшаных сем'яў — што, зразумела, зусім не рэдкасць, — дамінантным становіцца ўжо не беларускі культурны складнік. Таму пытанне, як унікнуць характэрнага для дыяспар "сіндрому аднаго пакалення", мае сапраўды жыццёвую важнасць.

На думку Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы Уладзіміра Дражына, асаблівую ролю тут павінна адыгрываць адукацыя. І беларуская гімназія імя Францыска Скарыны са сваёй задачай спраўляецца: у Вільнюсе яна лічыцца прэстыжнай.

У той самы час, сваю ролю тут могуць адыграць і культурныя праекты. Натуральна, моладзь не надта цягне ў традыцыйныя ансамблі. У нас гэта даўно зразумеў кожны руплівы дырэктар ДК — ды стварыў для новага пакалення адмысловую творчую "прынаду": эстрадную студыю ці нават рок-каманду. У беларусаў Літвы, на жаль, нічога падобнага няма.

■■■

Натуральна, згаданыя вышэй праблемы наўрад ці вырашальныя без праграмнай ды паслядоўнай палітыкі падтрымкі суайчыннікаў за мяжой. Як мы самі пераканаліся, дапамогі яны хаця і не просяць, але... рэальна яна патрэбна. У той самы час, і землякі могуць нам, што называецца, прыдасца.

Прыкладам, Мікалай Амялевіч бачыць вялікую перспектыву ў наладжванні міжнароднага супрацоўніцтва на "мясцовым" узроўні: калі адзін маленькі раён Беларусі пачынае сябраваць з канкрэтным маленькім раёнам Літвы. Яны абменьваюцца дэлегацыямі, распрацоўваюць сумесныя праекты... Паміж Шальчынінкаем ды Воранаўскім раёнам такія повязі існуюць ужо не першы год, а не так даўно Мікалай Амялевіч "пасватаў" і Іўеўскі. І знайшоў яму ў пару зусім не памежны Кайшадорскі раён. Дамова аб супрацоўніцтве ўжо падпісана, і абодва бакі паспелі атрымаць першыя порцыі карыснага досведу.

Або такі прыклад. У апошнія гады беларускае Купалле прапісалася ў неверагодна маляўнічым месцы — у некранутай пушчы Аўкштадварыскага нацыянальнага парку, на беразе прыгожага ляснога возера, дзе прытаілася турбаза. Канцэпцыя настолькі простая, што ёсць усе падставы назваць яе геніяльнай. Уявіце, быццам вы адпачываеце ў дзікім лесе, не сапсаваным чалавечым умяшальніцтвам, але не ў намёце, а ў катэджы з усімі выгодамі. Прычым сэрвіс не кідаецца ў вочы: ні табе гектараў асфальту, ні гучнай музыкі, ні якіх іншых агрэсіўных уварванняў у натуральнае асяроддзе. Такі падыход многім імпануе: хаця дарогу ў тую глушэчу так проста не патлумачыш, вольных дамкоў на турбазе не было.

Гаспадар турбазы — літоўскі бізнесмен беларускага паходжання Мікалай Калеснік. Родам ён з Дзятлаўшчыны. Калі землякі звернуцца да спадара Калесніка па майстар-клас на тэму эфектыўнага менджменту падобных турпраектаў, той, хочацца верыць, ім не адмовіць.

Ідэі, досвед, кантакты сапраўды маюць вялізную ролю. І нашы суайчыннікі здатныя істотна дапамагчы пашырыць "поле спазору", патрабуючы толькі аднаго — увагі.

Ілья СВІРЫН, Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, нашы спецыяльныя карэспандэнты
Мінск — Шальчынінкай — Вільнюс — Аўкштадварыскі нацыянальны парк — Мінск
На здымках: удзельнікі купальскіх святкаванняў; Мікалай Амялевіч ля помніка Кастусю Каліноўскаму.
Фота аўтараў

Кошт сацыяльнага сяброўства

Яўген ЯСЬКОЎ — дырэктар Абухаўскай дзіцячай школы мастацтваў, чалавек, для якога прафесійнае рэнамэ заўжды вышэй за велічыню заробку. Дзясяткі гадоў таму ведаў, на што ішоў. З таго часу прэстыж работніка культуры ў грашовым вылічэнні не павялічыўся. Урэшце, павінна ж быць хоць нешта стабільнае ў свеце...

А вось аўтарытэт Яўгена Яськова ад узроўню зарплаты не залежыць. У Гродзенскім раёне ягоная школа — адна з лепшых. Заўжды побач — жонка Ніна, аднадумца і выкладчыца Абухаўскай ДШМ. У Мінску — сын Канстанцін, вядомы ўжо кампазітар ды лаўрэат міжнародных конкурсаў. "Тылы", як кажуць, — забяспечаны. А дабрабыт збольшага замяняюць хатняя ўтульнасць і ўпэўненасць у тым, што ўсе Яськовы робяць справу, без якой свет быў бы шэрым...

Мы знаёмы ўсё жыццё, бо нарадзіліся ў Ветцы. Там ён таксама кіраваў музычнай школай. А на Гродзеншчыну прыехаў у 1991-м. У Абухаўскай ДШМ пад час майго прыезду распачынаўся бягучы рамонт…

Праблемы раённай ДШМ вырашаюцца аўтарытэтам кіраўніка

— Працаваў дырэктарам ДШМ у Сапоцкіне, — распавядае Яўген, — праз пятнаццаць гадоў перавялі ў Абухава...

— Наколькі я ведаю, тут была выключна складаная абстаноўка і з кадрамі, і з матэрыяльна-тэхнічнай базай. Музычную школу ў Абухаве ўвогуле хацелі закрыць...

— Прыкладна гэтак усё і было. Кіраўніцтва сельскагаспадарчага вытворчага кааператыву былі настроена на тое, каб менавіта такім чынам ліквідаваць праблему. У наш будынак нават меркавалася падсяліць амбулаторыю. Не хачу спыняцца на сутнасці тагачаснай праблемы... Заўважу толькі, што мне пашанцавала: у гэты ж год змянілася кіраўніцтва і райвыканкама, і аддзела культуры. Старшынёй стаў Ян Васілеўскі, а начальнікам — Ігар Лябецкі. З гэтага ўсё і пачалося. Лябецкі вырашыў будынак "адбіць". За кошт аддзела культура адразу распачалі рамонт. Уклалі каля 600 мільёнаў. Мэблю ў кожны клас рабілі па індывідуальнай замове. А старшыня мясцовага СВК Ілья Сінько дапамог з дахам (паркет на паверхах гніў ад дажджу), потым — з фасадам. Навакольная тэрыторыя добраўпарадкавана пры ягонай непасрэднай падтрымцы.

— Як навучыцца сябраваць з начальствам? Не "заляцацца", а — менавіта сябраваць.

— Уся справа — у сур'ёзнасці намераў. Калі кіраўнік бачыць, што я ў Абухаве — усур'ёз і надоўга, калі адчувае, што словы мае не разыходзяцца са справамі, дык і стаўленне да мяне — адпаведнае. З такога ўзаемаразумення і пачынаецца калі і не сяброўства, дык сацыяльнае партнёрства — абавязкова... Але сур'ёзнасць намераў неабходна пацвярджаць штодзённа. Вось такі ўніверсальны "рэцэпт" узаемакарыснага ўзаемадзеяння з уладамі...

— Колькі на пачатку твайго дырэктарства было вучняў?

— Каля сямідзесяці. Было шмат "мёртвых душ": лічыліся, але не вучыліся. Пачаў з адсеву такіх школьнікаў... На сёння ў нас — без малога 130 дзяцей, якія праходзяць навучанне на музычным і выяўленчым аддзяленнях. Дарэчы, непаўторны мастацкі роспіс нашых памяшканняў — справа рук менавіта нашых школьных мастакоў...

— А што цяпер замінае ў працы вам, дырэктарам ДШМ?

— Заканадаўчыя нюансы не заминаюць. Новыя навучальныя планы — дастаткова "гнуткія". Прынамсі, можна выкарыстаць шмат дадатковых гадзін за кошт прадметаў па выбары. Але ёсць пытанні па праграмах для музычных школ, асабліва — сельскіх. Тэхнічную базу гарадскіх устаноў і аграгарадоцкіх мо і не варта адрозніваць, бо іншым разам яна ў аграгарадках — больш грунтоўная. А вось дзеці ў гарадах ды сёлах — розныя. З гэтай нагоды і варта ўдасканаліць праграмы па сальфеджыа, музычнай літаратуры... Сённяшнія разлічаны на вельмі адораных дзяцей, якія збіраюцца працягваць музычную адукацыю і надалей... Не падумай, што ў нас такіх няма. Прафарыентаваныя групы мы па выніках іспытаў мэтанакіравана вядзём ад другога класа. І паступаемасць у нас — неблагая і сярод "музыкантаў", і сярод "мастакоў".

— Згодны, дзеці, арыентаваныя на агульную музычную адукацыю, могуць і не "загружацца" ў такіх памерах сальфеджыа. Для мяне, дылетанта, галоўнае ў тым, што падлеткі, выхаванне якіх палягае ў прасторы эстэтызацыі, не стаяць на ўліку ў камісіях па справах непаўналетніх. Яны — будучыя "прафесійныя" гледачы, слухачы і чытачы...

— Падобная эстэтызацыя павінна быць нормай і для агульнаадукацыйных школ. Уражанне часам такое, што мы выхоўваем прагматыкаў, а не асоб, здольных самастойна думаць і суперажываць, — вось гэта праблема з праблем. Таму, я думаю, у краіне іншым разам пустуюць кінатэатры, музеі ды бібліятэкі.

— Мы паглядзелі на школьныя цымбалы і гітары, зробленыя гродзенскім майстрам па замове... Якім чынам у раёне дамагліся вырашэння праблемы са зношанымі інструментамі?

— Я падаю заяўку ў аддзел культуры — заяўка задавальняецца. Гэтак жа робяць і калегі па раёне. У выніку ў нас амаль няма зношанага інструментарыя... І не забывай, што чым старэйшы баян, тым якасней ён зроблены. Майстроў з Мінска запрашаем штогод. Хапае інструментаў і для конкурсаў.

> "Уражанне часам такое, што мы выхоўваем прагматыкаў, а не асоб, здольных думаць і суперажываць... Вось таму, мяркую, у краіне іншым разам пустуюць кінатэатры, музеі ды бібліятэкі".

— Тры камп'ютары для сельскай ДШМ. Ці не замнога?

— Ну вось вырашылі спрасціць такім чынам выкладанне тэарэтычных дысцыплін. І гэта не "фішка" аграгарадка "Абухава", а патрэба часу, як мне падаецца. Аддзел культуры тут ізноў пайшоў насустрач. Камп'ютарныя класы павінны быць для аграгарадкоў нормай. Натуральна, карыстаюцца сучаснай тэхнікай не толькі вучні, але і выкладчыкі. Інтэрнэт — невычэрпная крыніца метадычнай дапамогі.

Гутарыў Яўген РАГІН

На здымку: дырэктар Абухаўскай ДШМ Яўген Яськоў.

Заканадаўцы сусветнай арт-моды: касмічныя цэны ды "інтэграваныя" імёны

"Арт-Базэль". Не буду падрабязна апісваць значнасць гэтага мерапрыемства: пра яго можна прачытаць у Інтэрнэце. Лішне згадваць, што гэты арт-кірмаш, або фестываль, з'яўляецца найбуйнейшым у свеце. У галерэйным асяроддзі яго параўноўваюць з Алімпійскімі гульнямі ці Канскім кінафорумам. Шмат гадоў запар езджу ў Швейцарыю, але наведаць "Арт-Базэль" ніяк не выпадала, і таму сёлета выправіўся адмыслова. Адразу скажу, што ўражанне аб ім склалася вельмі няпэўнае. Не сказаць, каб ён расчараваў, проста — уяўляўся іншым.

Найперш уразілі масштабы. У дадатак да старога павільёна дадаўся новы — павільён актуальных форм мастацтва "Unlimited". Яго плошча — 40 000 кв. м (для параўнання: плошча нашага Палаца мастацтваў — 1 800 кв. м). Акрамя таго, трэба ўлічыць мноства паралельных мерапрыемстваў і выставак па-за асноўнай праграмай, раскіданых па ўсім горадзе. Не лішне дадаць, што геаграфічна "Арт-Базэль" даўно перакінуўся ў Амерыку ("Арт-Базэль-Маямі-Біч"), а літаральна сёлета — і ў Азію ("Арт-Базэль-Ганконг").

Старая, галерэйная, частка экспазіцыі прадстаўлена, ва ўсіх сэнсах, лідарамі сусветнай арт-сцэны: Гагасян, Саатчы, Яблонка ды іншымі. Выяўлены ў большасці сваёй аўтары, праверанымі часам, якія забяспечваюць камерцыйны поспех удзельнікам: Уорхал, Ротка, Пікаса, Магрыт, Мур. Нягледзячы на касмічныя цэны, чырвоных кружочкаў вельмі шмат. Найбольш іх — на фатаграфіях, што сведчыць не толькі пра магчымасці тыражу, але і пра неверагодную папулярнасць гэтага віду мастацтва апошнім часам.

Нягледзячы на тое, было шмат і новых галерэй. Таблічкі з іх назвамі выдзелены адмысловым колерам. Трэба адзначыць, што і яны трымалі марку — як у сэнсе ўзроўню цэн, так і ў сэнсе ўзроўню экспазіцый. Усё было прадстаўлена вельмі густоўна, не было звычайнага для ўсходнееўрапейскіх кірмашоў "перагрузу". Дарэчы, такі спосаб экспанавання, як у нас (рама да рамы ды яшчэ ў тры паверхі), на Захадзе называецца — " Пецярбургская развеска".

Новы павільён, дзе былі прадстаўлены некамерцыйныя праекты актуальнага мастацтва, уражваў сваімі маштабамі і яшчэ раз пераконваў: вялікія праекты немагчы-

На людным месцы

Што смех напалохаў?

13 — 14 ліпеня ў палескім куточку, у вёсцы Спорава, на беразе мясцовага возера з размахам прайшло V Абласное свята народнага гумару "Спораўскія жарты".

БЯРОЗАЎШЧЫНА

Праграма была насычаная. 16 творчых дэлегацый вобласці выступілі ў гаспадарках Бярозаўскага раёна. На Гумарыстычнай мытні ва ўрочышчы Дубкі гасцей свята сустракалі "шкваркай і карасём". Каля Спораўскага цэнтра культуры і вольнага часу ўладкавалася Пасольства гумару і жартаў, а ва ўстанове адбылося адкрыццё Музея гумару, дзе кожны мог пакінуць у Шклянцы смеху анекдот.

Сярод гумарыстычных падарункаў былі і мотальскія каўбасы, і столінскія гурочкі, і пінскі трыкатаж, і лунінецкае сала. Па вёсцы прайшло тэатралізаванае шэсце, якое ўзначальваў аркестр з піянерскімі горнамі ды барабанамі. Але як толькі яно наблізілася да галоўнай пляцоўкі ля Спораўскага возера, чорныя хмары заслалі ўсё наваколле. Удзельнікі і госці свята з жахам сталі чакаць навальніцы…

Але адбыўся цуд: жарты, смех і арыгінальны выгляд артыстаў спалохалі хмары! І, нягледзячы на тое, што вецер парваў электрычныя правады, хмары схаваліся аж за Моталем. І зайгралі музыкі, і заспявалі ўдзельнікі свята! Адкрылася мноства гумарыстычных выставак ды атракцыёнаў...

Пераможцамі V Абласнога свята народнага гумару "Спораўскія жарты" сталі творчыя дэлегацыі Лунінецкага (І месца), Бярозаўскага і Драгічынскага (ІІ месца) раёнаў. Віншуем усіх пераможцаў!..

Вольга ЗІНОВІЧ, вядучы метадыст па тэатральным мастацтве Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра

З 20 ЛІПЕНЯ **а • ф • і • ш • а «К»** ДА 27 ЛІПЕНЯ

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

- Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.
- Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.
- Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.

Выстаўкі:

- **Стасіс Красаўскас (1929 — 1977 гг.)** (графіка літоўскага мастака) — да 25 ліпеня.
- **"Партрэты ўладароў і магнатаў Вялікага Княства Літоўскага"** (з музеяў Львова і Луцка) — да 26 жніўня.
- **"Слуцкія паясы"** (са збору Львоўскага гістарычнага музея) — да 18 красавіка 2014 г.
- Выстаўка Івана Міско **"Космас"** — да 29 ліпеня.
- **"З мінулага ў будучыню"** — да 26 жніўня.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка В.Паўленка **"Той абрус, што мама вязала"**.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:

- **"Старажытная Беларусь"**.
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы"**.
- **"Водбліскі ваеннай славы"**.
- **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пач. XX стст."**.
- **"Вайна 1812 г. у гісторыі Мінска"**.

Выстаўкі:

- **"У промнях веры хрысціянскай"**.
- Фотавыстаўка Дзяніса Раманюка **"Беларусь Сінявокая"** — да 31 жніўня.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"



г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:

- Фотавыстаўка **"Мір стары — Мір новы"**.
- Выстаўка **"Наваградскі край вачыма Канута Русецкага. З альбома 1844 — 1846 гг."** — да 30 верасня.
- Выстаўка васковых фігур **"Кола гісторыі"** — да 26 ліпеня.
- Выстаўка з фондаў музея **"Халодная зброя XVI — XVII стст."** — да 29 ліпеня.
- Выстаўка аўтарскіх лялек **"Малая гасцёўня"** — да 31 верасня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА



г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:

- **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
- Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
- Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.

Выстаўкі:

- **"Зямля мая мяне заве..."**, прымеркаваная да 70-годдзя напісання паэмы Якуба Коласа "Суд у лесе" і да вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ



г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.

- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце.
- Цыкл музейна-педагагічных заняткаў з элементамі тэатралізацыі **"Дзядзька Янка, добры дзень!"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту і сямейнага наведвальніка.
- Інтэрактыўная гульня **"У пошуках папараць-кветкі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
- Выстаўка **"Былое ў думках ускрашаць..."**, прымеркаваная да 100-годдзя напісання Янкам Купалам рамантычных паэм.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ



г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.

Выстаўкі:

- **"Партызанскі лагер"**.
- Выстаўка дзіцячага малюнка **"Я памятаю! Я ганаруся!"**.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ



г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:

- Творы **Нікаса Сафронава** — да 8 верасня.
- **Арт-праект "Zabor"** (агароджа цэнтральнага парку) — да 26 ліпеня.
- Выстаўка работ Марыі Быкавай **"Цені палацавай эпохі"**.
- Выстаўка скульптуры А.Ляонава **"Па покліч прыгажосці"** (Украіна) — да 28 ліпеня.
- Выстаўка гравюры французскага часопіса "Le Monde illustre" **"Паўстанне 1863 — 1864 гг."** — да 4 жніўня.
- Выстаўка жывапісу В.Кожуха і скульптуры С.Бандарэнкі **"Чыстае, светлае, роднае"** — да 5 жніўня.
- Старажытнаруская дружынная культура ў археалагічных артэфактах **"З кап'я ўскормленыя"** — да 31 жніўня.

Экспазіцыі:

- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Чырвоная гасцёўня"**.
- "Зала ўрачыстых прыёмаў".
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца

Экспазіцыя:

"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".

Выстаўкі:

- **"Радкі, імёны, лёсы"** (выстаўка літаратуры к. XIX — пач. XX стст. са збору князёў Паскевічаў).
- **"Класікі беларускага мастацтва"** (выставачна-адукацыйны праект).

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:

- **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстаўкі:

- Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

Свет субтрапічных раслін і жывёл.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА ГОМЕЛЯ



г. Гомель, вул. Пушкіна, 32. Тэл.: (8-0232) 74-28-23.

Экспазіцыі:

- Інтэр'еры гарадскога асабняка к. XIX — пач. XX стст.
- Прагулкі па старым Гомелі.
- Гісторыя Гомеля ад старажытнасці да пачатку XX ст.

Выстаўкі:

- Фотаапараты і фотатэхніка XX ст. (каля 100 адзінак, перададзеных у дар Музею гісторыі г. Гомеля Леанідам Пінскім).

ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІІ



г. Гродна, вул. Замкавая, 16. Тэл.: (8-0152) 74 25 13.

Экспазіцыі:

- **"Рэлігія і культура ў Беларусі"** (ад старажытных часоў да XXI ст. — архаічныя вераванні, хрысціянскія канфесіі, іслам, іудаізм).
- **"Эпоха. Час. Будынак"** (гісторыя палаца, у якім размешчаны музей, сямейныя традыцыі і каштоўнасці XIX — пач. XX стст.).

Выстаўка:

- **"Святыні Бацькаўшчыны"** (храмы Беларусі на старых паштоўках).
- **"Дрэва добрае"** (да 1025-годдзя Хрышчэння Русі).

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- Выстаўка **"Скрозь агонь баёў"**.
- На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 22 44.

- Пастаянная экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выстаўкі:

- **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна..."**.
- **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст."**.
- Выстаўка адной карціны **"Партызаны"**.
- **"Прывітанне, ранейшая Ліда!"**.
- **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60"**.
- Турыстычна-пазнаваўчая праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-Й ПАЛОВЫ XIX ст."



г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

- Пастаянныя экспазіцыі: **"Парадныя залы"**, **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**, **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
- Выстаўка адной карціны Адама Шэмеша **"Партрэт Людвіка Кандратовіча (Уладзіслава Сыракомлі). 1854"** (са збору Літоўскага мастацкага музея).
- **"Аўтапартрэт"** Валенція Ваньковіча.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ



Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: (8–01770) 5 51 81, 5 31 96, 2 06 02

Малыя выставачныя залы ансамбля:

- **"Выратаваныя мастацкія каштоўнасці"** (творы, канфіскаваныя Брэсцкай мытняй і мытняй "Заходні Буг" пры спробе іх незаконнага вывазу за мяжу) — да 4 жніўня.

Інфармацыйна-касавы цэнтр:

Фотавыстаўка **Уладзіміра Суцягіна.**

- **"Скарбы Беларусі"**.
- **"Камунальная кватэра"**.

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП



г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

- Выстаўка **"Усходні вектар. В'етнам"**.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА



г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 290 60 10.

Выстаўкі:

- Выстаўка **Валерыя і Міхаіла Свістуновых** — да 28 ліпеня.
- Залатая калекцыя з фондаў Беларускага саюза мастакоў — да 28 ліпеня.

ТЭАТР

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7. Тэл./факс: 227 60 81.

- **22, 28, 29 — "Паўлінка"** Я.Купалы.
- **25 — "Офіс"** І.Лаўзунд.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.

- **21 — "Блакітная камея"** К.Брэйтбурга.
- **22 — "Містар Ікс"** І.Кальмана.
- **23 — "Звычайны цуд"** Г.Гладкова.
- **24 — "Асоль"** У.Саўчыка.

Пажарнай службе Беларусі — 160 гадоў

27 ліпеня ў сталічным парку імя Максіма Горкага адзначаць Дзень пажарнай службы. Тут пройдзе парад і паказ пажарнай аварыйна-выратавальнай тэхнікі з элементамі баявой працы. Будзе вельмі цікава!

А ў далёкім 1853-м у Мінску ды іншых гарадах нашай зямлі былі сфарміраваны пажарныя часткі. З таго часу і пачаўся адлік гісторыі развіцця пажарнай службы. За гады назапашаны магутны патэнцыял, наладжана здольнасць аператыўна і на высокім узроўні вырашаць задачы па папярэджанні і ліквідацыі практычна ўсяго пераліку надзвычайных сітуацый. Тое дазволіла стварыць у 1998 годзе на базе ваенізаванай пажарнай службы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Ратавальнікі нашага пакалення працягваюць і прымнажаюць слаўныя традыцыі сваіх папярэднікаў, традыцыі ваенізаванай пажарна-выратавальнай службы, на аснове якой сфарміраваны структуры, органы і падраздзяленні па надзвычайных сітуацыях.

Галоўныя ўзнагароды для выратавальніка — пераадоленне сябе і перамога над небяспекай, а найважнейшая мэта — жыццё чалавека. За дзесяцігоддзе работнікамі МНС Беларусі было праведзена звыш 250 тысяч аперацый, выратаваны больш за 50 тысяч чалавек. Міністэрства па надзвычайных сітуацыях вызначае галоўным прыярытэтам у сваёй дзейнасці павышэнне эфектыўнасці абароны грамадзян і эканомікі краіны ад бедстваў.

Сёння больш за 48% надзвычайных сітуацый, якія ўзнікаюць, ліквідуюцца на працягу пятнаццаці хвілін з моманту прыбыцця першага падраздзялення, што дазволіла знізіць агульныя эканамічныя страты.

Нумар "101" вядомы кожнаму. У любой складанай сітуацыі грамадзяне звяртаюцца да тых, хто заўсёды на пасту.

Таццяна БЫЧАНОК, спецыяліст групы прапаганды і навучання Савецкага РАНС г. Мінска

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года

Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ

Рэдакцыйная калегія:
Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Міхаіл БАРАЗНА, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Кацярына ДУЛАВА, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Барыс СВЯТЛОЎ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.

Рэдакцыя:
Марына САМОНЧАНКА (адказны сакратар).

Рэдактары аддзелаў:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН.

Спецкарэспандэнт:
Пётр ВАСІЛЕЎСКІ.

Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ

Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД

Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС

Адрас рэдакцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Тэлефоны:
(017) 290 22 50,
(017) 286 07 97,
(017) 334 57 23
Тэлефон-факс:
(017) 334 57 41
Рэкламны аддзел:
тэл. (017) 334 57 41

www.kimpress.by

E-mail: kultura@tut.by

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

*Матэрыял на правах рэкламы.

"Культура", 2013. Індэксы 63875, 638752 Наклад 7 185

Падпісана ў друк 19.07.2013 у 15.30
Замова 3047
Дзяржаўнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва" Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0003879 ад 17 красавіка 2009 г.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77.
Прыёмная: (017) 290 22 50.
Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35

QR-код:

9 771994 478007 13029